Трагедыя Елянкі і Кляшчэляў ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАЛЯНЦІНА КАМАЖЭЎСКАЯ ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 30 (2515) Год XLIX | Беласток, 25 ліпеня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

„Сцяна” на Сакольшчыне

У Саколцы як у жартоўнай песні: сонца свеціць — дождж ідзе...

А я іду на рэйд „Сцяна”.

Пачатак вандроўкі 5 ліпеня, збіраемся ў поўдзень пад падстрэшкам прывакзальнай крамы.

— Файна, што прыехалі! — вітае мяне і маіх канадскіх гасцей Мішка Сцепанюк, старшыня Звязу. (Сярод маіх сяброў іх адных удалося намовіць на рэйд).

Сапраўды, файна — пасля прывітання пераапрануць нас у чорныя кашулькі-цішэрты з рэкламай Звязу беларускай моладзі, з іх інтэрнэтнай старонкай *www.sonca.org* і нашага шляху: Саколка — Валілы. На маёй, яшчэ і белы рыцар, такі як у гербе горада.

— Ці ёсць людзі з самой Саколкі? — пытаю.

— Ёсць адзін, — Мішка прадстаўляе Паўла Ляшчынскага, студэнта філасофіі. Дойдзе яшчэ яго брат, Мацек, які пакуль у раз'ездах. Карацей, сам арганізуе транспарт, бо шафёр, які меў везці „жучкам” усе клункі, занямог.

Яшчэ ў Саколцы частка ўдзельнікаў ідзе на праваслаўныя могілкі на магілу кампазітара Яна Тарасевіча.

Там палівае нас дождж...

* * *

Першы адрэзак шляху: Саколка — Павэлкі. Восем кіламетраў. Якраз, каб нарабіць пякучых мазалёў. Надвор'е як на заказ рэзка мяняецца. Ужо і горача, і спякотна. Першую вёску Каменку абыходзім краем.

Не тое, каб баяліся. Кампанія ў нас вялікая — дваццаць шэсць душ. Палова гэта студэнты. З Беластока, Варшавы, Познані, Ольштына. Апошнія — белліцэісты.

У Войнахах, дзе амаль пры кожнай хаце каплічка з Божай Маці, нечаканая хваля пачуццяў:

— Jak ja was lubię! — спыняе нас пасярэдзіне вёскі падвыпіўшы аўтахтон. На доказ, выцягвае з кішэні кашалёк і высыпае залатоўкі.

— Macie, macie na oranżadę, — тыцкае нам грошы.

Іншы, таксама пад мухай, зачапляе нас па-беларуску:

— Каторая з вас будзе мая?!

Тут трэба дадаць, што сярод вандроўчых амаль палова гэта дзяўчаты.

Наш новы знаёмы асцерагае нас перад Куроўшчынай.

— O, k..., Unia do nas idzie! — панеслася пад малачарняй у Куроўшчыне.

* * *

У Куроўшчыне замест спыняць і навязвацца, як абяцалі ў дарозе, мясцовыя кавалеры прыхаваліся ў малачарні. Пад крамай курыліся яшчэ адціснутыя ў пяску сляды фільцавых гумоўцаў.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

М. Сцепанюк: Сакольшчына — для мяне адкрыццё! Краявід, шчырыя людзі...

— А ці ў вас людзі задаволены *уніяй*? — пытаем сустрэтую на загуменні цётку ў суседніх Павэлках.

— Да *уніі* to było życie! Ludzie lepiej jak w Ameryce żyli.

Наша субяседніца ведае ўсё гэта па сваёй сям'і.

— Як сын у Амерыку ехаў, то як пан выглядаў: тоўсты, чырвоны, здаравенны быў. Як Амерыкі пакаштаваў — і глядзець страшна.

У Павэлках выклікаем сенсацыю. Асабліва канадзец Ян.

— Jak to możliwe, — не можа надзівавацца наша цётка, — że pan z Kanady i po prostemu mówi.

Разам здзіўляюцца і апошнія аўтахтоны, якія абступілі нас кругам. Найстарэйшы ў грамадзе, дзедка Уладзік, кажа:

— Канада, вялікі край — усё можа быць. А ці ж там, думаеце, простых людзей няма?!

* * *

Першую ноч правядзем ва ўрочышчы Альшына, што каля хутара гарманіста Мажэйкі. На ўзгорку, дзе расклаўся наш абоз, чырвона ад суніц. У кампаніі вясёлы настрой, як за часоў першых рэйдаў „Бацькаўшчына”.

— Мы знаёмыя з ліцэя, — кажуць студэнты родам з Гайнаўкі, — зараз, калі кожны жыве ў іншым горадзе, вельмі хочацца сустрэцца, пабачыцца, паразмаўляць па-свойму.

Ужо ў першы дзень большасць размаўляе па-падляшску.

— А ты адкуль ведаеш усе падляшскія песні? — пытаю Паўла з Саколкі.

— Мой бацька з Нарвы. А песні? Бываю ў Дарка Фіёніка ў Студзіводах.

Сучасны рэйд „Сцяна” падобны да „Бацькаўшчыны” з краязнаўча-навуковымі доследамі. Вось, сёння ля вогнішча адбудзецца даклад пра кампазітара Яна Тарасевіча з недалёкага Шындзеля. Пазней наведае нас мастак Лявон Тарасэвіч. І толькі дождж, які з вечара зноў пральецца з неба, загоніць нас спаць у палаткі.

* * *

— Толькі ў першы год на „Сцяну” прыйшло так многа людзей, — кажа экс-шэф Звязу Юрка Асеннік.

Рэйд адбываецца з 1993 года. У час першых вандровак былі сфатаграфаваныя этнаграфічныя і ментальныя асаблівасці падарожжаў. За гады назбіралася многа цікавага, праўда, архіўныя здымкі яшчэ належна не распрацаваныя, чакаюць лепшага часу.

Сёлетні маршрут ішоў шляхам: Саколка — Павэлкі — Новае Трасцяное — Новы Востраў — Лапічы — Нятупа і закончыўся 11 ліпеня ў Валілах.

— Па дарозе наведалі мы царкву ў Грыбоўшчыне, — пералічвае Мішка Сцепанюк, сустрэліся з Сакратам Яновічам у Крынках, гасцявалі на плябаніі ў Новым Востраве. У Лапічах пазнаёміліся з гарадской моладдзю, якая пасялілася тут у пошуках іншага стылю жыцця. Гэта карціна з іншага свету. Сама Сакольшчына для мяне — адкрыццё! Краявід, шчырыя і гатовы падзяліцца апошнім людзі...

Маё знаёмства з Сакольшчынай было падобнае, калі дваццаць гадоў таму, разам з БАСаўскімі рэйдамі мы абышлі ўсе беларускія мясціны. Успамін краявідаў і перажытага прыцягваў пасля як магніт. І зараз, думаю, усе мае ніўскія тэмы пачаліся, менавіта ў час студэнцкіх вандровак. Магніт, як відаць на маім прыкладзе, дзейнічае па сённяшні дзень.

Ганна Кандрацюк

Гадавіна 27 ліпеня ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Гэтыя чатырнаццаць гадоў можна выразна падзяліць на два перыяды — да 1994 года (усталяванне дзяржаўных інстытутаў) і пасля (знішчанне незалежнасці краіны). Можна ў якасці падзелу ўзяць і 1993 год, калі Кебіч высунуў ідэю адзінай рублёвай зоны з Расіяй. Наменклатурная бюракратыя ўжо ачомалася і пачала сваю калабарацыяніцкую палітыку...

Здаравейшы без саветаў ☞ 2

Сакрат Яновіч

Беларусь адганяе ад Еўропы... русіфікацыя. Пераўтварэнне яе, малую, у дадатак да велізарнае Расіі, у ейную зацюканую правінцыю (з некаторымі атрыбутамі аўтаномнасці). Русіфікацыя значыць не толькі перайманне рускай мовы ды культуры, але разам з тым і расійскага светапогляду...

Арлянскі капіталізм ☞ 4

Міхал Мінцэвіч

Падаткі з'яўляюцца галоўнай крыніцай бюджэтных паступленняў кожнай гміны. Яны вырашаюць пра яе дзейнасць, уплываючы на размах гмінных мерапрыемстваў, а спосаб іх выкарыстання вырашае пра напрамак развіцця. У Арлянскай гміне многія людзі бяднеюць і не маюць з чаго плаціць падаткаў...

Міжнацыянальнае жыццё ☞ 5

Уладзімір Лапцэвіч

На высвятленне і аналізаванне варункаў жыцця нацыянальных і рэлігійных меншасцей на Падляшшы была накіравана праца Рабочай групы ў складзе дырэктара няўрадавай арганізацыі „Дыялог” з Казахстана Ігара Савіна, аспіранта Белдзяржуніверсітэта, рэдактара часопіса „Палітычная сфера” Андрэя Казакевіча і прадстаўніцы забароненай беларускай праваабарончай арганізацыі „Вясна” Паліны Сцепаненкі...

Беларусь у Кракаве ☞ 8

Яўген Міранові́ч

Усё часцей беларусазнаўчыя навуковыя сустрэчы арганізуюцца ў Польшчы далёка ад усходняй мяжы. Праўдападобна гэта вынік таго, што беларускай праблемай займаецца штораз больш вучоных у Познані, Торуні, Кракаве, Вроцлаве, Ольштыне, Любліне. У Беластоку, наадварот, з-за крэсавай закамплексаванасці зацікаўленне найбліжэйшым памежжам невялікае...

Запіскі кантрабандыста ☞ 10

Сымон Нальшанскі

— Каб жыць у радасці і шчасці, трэба красці, красці і красці, — рашуча заявіў седзячы ля цёплага ляснога вогнішча Мікола...

9 770546 196000

Вера „страчанага” пакалення

27 ліпеня 1990 года Вярхоўным Саветам была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь. Савецкая перабудова скончылася, пачаўся сутнасна новы адлік. Упершыню пасля 25 сакавіка 1918 года Беларусь абвясціла дзяржаўную незалежнасць.

Гэтыя чатырнаццаць гадоў можна выразна падзяліць на два перыяды — да 1994 года (усталяванне дзяржаўных інстытутаў) і пасля (знішчанне незалежнасці краіны). Можна ў якасці падзелу ўзяць і 1993 год, калі Кебіч высунуў ідэю адзінай рублёвай зоны з Расіяй. Наменклатурная бюракратыя ўжо ачомалася і пачала сваю калабарацыянісцкую палітыку, але інерцыя дзяржаўнага будавання яшчэ брала сваё. Новаму „главнакамандуючэму” спатрэбілася каля году часу, каб развярнуць краіну на Усход. За дзесяць гадоў ад дзяржаўнасці засталіся толькі два знешнія элементы — назва дзяржавы і свае грошы. Усё астатняе — гімн, сцяг, герб, мова, мяжа, знешняя палітыка, святы — альбо чужынскае, альбо сурагатнае. Ёсць, праўда, галоўны чыннік, які дазваляе аптымістычна глядзець у перспектыву. Гэта — дзяржаўна-нацыянальная самаідэнтыфікацыя людзей. Вынікі апошняга перапісу насельніцтва яскрава выявілі рост свядомасці ў нацыянальным рэчышчы. Мова, хаця і засталася галоўным фактарам (інакш і быць не можа!), але перастала быць адзіным паказнікам нацыянальнай тоеснасці.

Характэрна, што на пачатку кіравання першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 27 ліпеня яшчэ прызнавалася як дзяржаўнае свята, хаця яно і заставалася на другім плане. Спаквеля, аднак, дзяржава стала „забываць” непатрэбную ёй дату. Абсурдальна днём незалежнасці пачалі называць 3 ліпеня — дзень вызвалення Мінска ад фашысцкай Нямеччыны. Хаця добра вядома, што 3 ліпеня 1944 года значная частка Заходняй Беларусі заставалася пад гітлераўцамі. Сёлетняе святкаванне 60-х угодкаў „освобождения” Беларусі набыло характар сапраўднай ідэалагічнай істэрыі. Уражанне такое, што нічога больш у гісторыі Беларусі не было. Сімволіка гэтага свята скрозь мілітарысцкая. Чырвона-зялёны „человек с ружьём” запаланіў вітрыны крамаў, вулічныя расцяжкі і тэлевізійныя экраны. За саветамі гістарычна культавым быў 1917 год, але ад міфаў рэвалюцыі, якая „заззяла свету” праз дзесяць гадоў ад пачатку галоснасці засталіся толькі аскепкі. Тое ж будзе і з другой сусветнай вайной. Сённяшняя „культывацыя” „Вялікай айчыннай” не прынясе палітычных дывідэндаў рэжыму ўжо ў бліжэйшай перспектыве. Укараніць у масавую свядомасць псеўдапатрыятызм не ўдасца. Не той час.

Вядома, што няма нічога цяжэйшага, чым вызваляцца ад „вызваляльнікаў”. Але Беларускую дзяржаўнасць у гістарычным кантэксце як багдановічаўскую Пагоню „не разбіць, не спыніць, не стрымаць”. Пытанне толькі ў тым, ці дачакаецца „залацістага яснага дня” цяперашняе пакаленне трыццаціпяці-саракапяцігадовых. Прыйшоўшы ў сярэдзіне васьмідзесятых у нацыянальнае Адраджэнне, яно так і не здолела напоўніцу адчуць смаку вольнасці іх дзяржавы. Яно жыве пад маральным таўром „у гэтай краіне не маю я дому”. Адныя спіліся, іншыя падаліся ў „дзеці капітала гранта”, трэція з'ехалі на эміграцыю, чацвёртыя працягваюць змаганне, але ўжо знявераныя амаль дваццацігадовым, пераважна адмоўным, досведам. Апошнія разумеюць, што ў іх не будзе пасадаў, на якіх яны здолеюць працаваць на карысць Бацькаўшчыны і зарабляць сабе на годнае жыццё, не будзе пенсіі, забяспечанай старасці і належнай ацэны іх дзейнасці. Гэта ім найбольш пагражае дыктатура, якая ўсё больш звярэе. Больш таго, гэтыя самаахвярныя рупліўцы, ледзь не апошнія рамантыкі ў скрозь прагматычнай палітычнай Еўропе. Яны шчыра вераць у абязковасць слова, сілу дамовы і салідарнасць, наіўна спадзяюцца на дапамогу звонку. Яны, у адрозненне ад маладзейшых, якія вывучыліся на розныя мовы і масава з'язджаюць у замежжа, не патрэбныя нідзе. Але час і Айчыну не выбіраюць. Яны нарадзіліся беларусамі і як бы цяжка не было, імі застануцца. Бо вера ў сапраўднае вызваленне заўсёды мацней страху і расчараванняў. А дата 27 ліпеня яшчэ зойме належнае месца ў календары беларускай дзяржавы.

Уладзімір Хільмановіч

Здаравейшы без саветаў

Днямі сустрэўся я з беларускім рэйдам маладых „Сьцяна”. Дапамог знайсці зацішак у непраўдападобна запушчаным парку колішняга двара дэ Вір'яна за ўзмежным азерцам, што на ўзбочным ад касцёла лузе. Сонечна, цяпло, без камароў. Папрасілі дзяўчаты і хлопцы распавесці ім пра гісторыю мястэчка ды наваколля. Меў пра што, але чамусьці пранізала ўсяго мяне нейкая здранцвеласць. Проста неахвота. Магчыма, ад старасці? Ад таго, што на сваім, некароткім, вяку распавядаў тое сотні разоў для тысячаў чалавек. Нават у тым жа мястэчку не раз і не два. І апісаў, і чыталі. Толькі цяпер успамінаецца: што: слухалі, хвалілі, але не пыталі-не распытвалі. Прымалі да ведама, і столькі. Без эмоцыяў цікавасці.

Так здарылася і ў апошні раз. Я сядзеў у сяброўскім крузе, на палянцы з травою ў чалавечы рост, быццам з казакамі ва ўкраінскім стэпе, бачачы ўдалечыні тое ж маляўнічае мястэчка Крынкі, якому, шчыра кажучы, напляваць на тысячу гадоў свае гісторыі. І хоць я даўно ўбіў у тутэйшыя галовы вялікае мінулае, аднак як бы лішняе кабетам і мужыкам у агародах і ў полі. Яно хлеба не дае, вось. Крынкаўчанам важна выперці дзяцей на хлебны Захад (дзяўчат у Італію і Швецыю, хлопцаў у Нямеччыну і Англію). Там ім будучыня, у пяць разоў большыя заробкі, пух кватэрнае выгоды. Яны жывое пацвярджэнне тэзы, што без пачуцця айчыны няма развіцця. Крынкі раз'едуцца па свеце, зарастуць лесам, бы тыя гарады майяў у джунглях Сярэдняй Амерыкі...

Ці мне іх шкада? Так і не! Не магу шкадаваць людзям большага кавалка хлеба. Адначасна шкадую, што не стварылі свайго раю, пабеглі на гатовае несваё. Гэта канец гісторыі Крынак, як бывала з іншымі беднымі тэрыторыямі; адразу нагадаюцца і багатыя цывілізацыі, астанкі якіх сённячы адкопваюць вучоныя археолагі (хаця б той біблейскі Вавілон).

З такімі думкамі і настроем я не ахапіў маладых нейкім полымем энтузіязму. Бо і чаму?! Сумленне не дазволіла колерна гаварыць у шэрасць пачатку другога тысячагоддзя Крынак (заснаваных Гродам у XI ст.).

Чым менш беларускасці наўкола, тым гусцей ад беларускіх імпрэзаў. Паспявай на іх, а ўжо не хочацца і ногі баляць. Нядаўнімі днямі звалачыўся быў у Кракаў, на польска-беларускую навуковую канферэнцыю „Шлях да ўзаемнасці”. Нагода паразважаць у натоўпе дактароў навук ды універсітэцкіх прафесараў пра перспектывы беларусам і Беларусі ў цяперашнім свеце. Высновы нам даволі трагічныя: мы, беларусы, самі не развіваемся, а ўсё разлічваем на кагосьці. Тыпова каланіяльны люд з нас. Белыя негры Еўропы.

Інтэграцыя Беларусі з Расіяй — гэта капец Беларусі! Стаўшы расійскай правінцыяй, спазнае яна „русскую бедность” і па-чужынску залатое багацце Масквы з Пецярбургам. Расія ўяўляе сабою дзікі кантраст паміж цэнтрам яе, у якім перапоўненыя рэстараны і кабакі, дзе кліенты плацяць пачкамі долараў, а кантынентальнай Расіяй, дзе гадамі не бачаць якіх-колечы грошай. Таму гэта так, бо Расія ніколі не развівалася на доўгую дыстанцыю, усё заваёўвала і прадавала на Захад бяздонныя залежы прыуральскай нафты, газу, вугалю, беручы з-над Атлантыкі знакамітыя тэхналогіі, калі мела такую патрэбу. Не думайма, што петрадолары браў расійскі „колхозник” або, прынамсі, сібірскія гарады, што пампуюць божыя дары ва ўсякія трубаправоды.

Так ад тысячагоддзяў: хвалі развіцця коцяцца ад таго ж Захаду, каб апасці зараз за Дняпром, натуральнай мяжою еўрапейскасці, у нас ужо перыферыйнай (так сказаць: загуменнай).

Мы яшчэ і тым адрозніваемся ад рускіх, што верым слову, абвінавачваем махляроў. А ў Расіі пропасць між словам і ўчынкам! Там нават не спрабуюць ашукваць (каб ашукваць трэба веры слову).

Беларусь адганяе ад Еўропы... русіфікацыя. Пераўтварэнне яе, малую, у дадатак да велізарнае Расіі, у ейную зацюканую правінцыю (з некаторымі атрыбутамі аўтаномнасці). Русіфікацыя значыць не толькі перайманне рускай мовы ды культуры, але разам з тым і расійскага светапогляду, благіх адносінаў да Еўропы і свету. Расія ад сваіх пачаткаў апынулася не ў Еўропе, як некалі Беларусь, але ж паміж Еўропаю і Азіяй. Гэта маскоўская дзяржава на двух кантынентах з замашкамі на ўвесь зямны шар. Такая дзяржава не можа быць у Еўрасаюзе, бо ёй Еўрасаюз — гэта дробязь, „сущая ерунда”. Яна пнецца на хрыстазбаўцу ўсяму чалавецтву (сама не маючы чаго есці).

Русіфікацыя Беларусі пераступіла, аднак, свой крытычны парог, ад якога пайшла-паехала ўжо ***сама****русіфікацыя. Беларускую культуру маргіналізавана да грамадскай неістотнасці ў выглядзе беларускамоўных маргіналаў, людзей без будучыні. Стратэгічна важным засталося нам адно: утрымаць беларускую дзяржаву. У краіне, якая самарусіфікуецца — г.зн. па ўласнай волі выліквідаваўшы найперш беларускамоўныя школы — рэальныя шанцы на палітычную ўдачу маюць палітыкі савецкага тыпу Лукашэнкі.*

Такая Беларусь — гэта цень Беларусі. Такая Беларусь мяне не цікавіць. Цікавіць не Рэспубліка Беларусь, але беларуская нацыянальная культура, бо нарадзілася яна як еўрапейская, і дзеля якой ахвотна жыць. Не маю аніякага жадання наведвацца туды, шануючы такім чынам здароўе. Гэтая беларуская Расія — скарот РБ тлумачыцца ***не*** *як Рэспубліка Беларусь, а Руская Беларусь — адымае гады жыцця.*

Лепей не глядзець у той бок, то яшчэ пажывеш.

Сакрат Яновіч

Вачыма еўрапейца

Паскарэнне бегу

Пераглянуў я ў апошнія дні выдадзены польскім Міністэрствам замежных спраў даведнік „Паляк за мяжой 2004”. Апісаны ў ім прыдатныя інфармацыі для польскіх грамадзян, якія выбіраюцца па-за тэрыторыю краіны. Вядома, асаблівую ўвагу звярнуў я на частку прысвечаную Беларусі. І калі б планаваў выезд у гэтую рэспубліку, дык пасля прачытання парад МЗС хутчэй адмовіўся б. Вось, асцерагаюць, што, калі не будзе ў мяне важнага пасведчання аб бязмытным увозе, можа гэта пагражаць канфіскацыяй аўто. Калі б не было ў мяне ў параджэнні аптэчкі, асцерагальнага трохкутніка, запасовага кола, наклейкі на шыбе „PL” ці важнага тэхпашпарта, заплаціў бы я штраф да пару дзесяткаў долараў. МЗС дае параду, каб я, яшчэ да перасячэння мяжы, дапаўна заправіўся яшчэ ў Польшчы, бо пасля могуць быць у мяне цяжкасці з палівам. Суцяшальная падказка, што галоўныя беларускія дарогі — шырокія і вельмі добра ўтрыманыя ды азначаныя. Але і тут ёсць адно „але”. Ёсць няблага, ды за выняткам абочын, якія ноччу малавідочныя. Ведамства замежных спраў асцерагае перад „экзотыкай” (?!): „Вельмі часта па аўтастрадах рухаюцца хатнія жывёлы”. У Польшчы таксама нярэдка шпацыруюць яны сабе супраць плыні аўтамашын, толькі што фактычна тут няма такога тыпу дарог. Іншая пагроза, на чыноўніцкую думку: на тамашніх аўтастрадах пакінутыя на іх „ляжачыя вялікія прадметы” (у Польшчы — хутчэй не прадметы, а п'яныя вадзіцелі ровараў).

Работнікі Міністэрства прабуюць, аднак, дзе-нідзе захаваць поўны аб'ектывізм. Успамінаючы аб пытаннях бяспекі, сцвярджаюць: „Пагроза злачыннасці — насуперак тыповай думцы — у Беларусі невялікая, намнога меншая, чым у Польшчы. Не здараюцца напады на кіроўцаў на дарогах, рэдка даходзіць да крадзяжу машын, хутчэй трапляюцца ўзломы ў аўто, асабліва ў папулярных месцах, ці дробныя крадзяжы ў гасцініцах”. У іншым пункце — сапраўды, у надта дыпламатычным стылі — успамінаюць аб хабарніцтве ва ўстановах: „У выпадку неабходнасці афармлення спраў у мясцовых установах, чужаземец мусіць быць падрыхтаваны на працяглыя фармальныя працэдуры ці магчымыя выпадкі дадатковых аплат з мэтай паскарэння бегу спраў”.

Агулам, польскі турыст у Беларусі мусіць адчуваць сябе — на думку МЗС — няблага, нават калі паслухае парад і будзе прымушаны на даўжэйшую пабыўку запасціся харчом у Польшчы. Прывяду найважнейшую з заахвот у цэласці: „Няма спецыфічных і звычаёвых праўных нормаў, парушэнне якіх магло б давесці да канфліктных сітуацый. Беларусы звычайна адносяцца да палякаў вельмі цёпла і ветліва, асабліва ў заходняй частцы краіны, дзе пражывае польская меншасць, да таго шмат беларусаў паслугоўваецца ламанай пальшчызнай, што палягчае кантакт”. Варта тут дадаць, што таксама шмат палякаў карыстаецца таксама „ламанай расейшчынай” (якая дамініруе ж у Беларусі), а шмат з выязджаючых — не такой ужо і ламанай — беларушчынай. А калі б, дарагі турыст, дайшло да якой спецыфічнай канфліктнай сітуацыі, дык я раю аддаць у вечнае карыстанне нацыянальнай беларускай памяццю Міцкевіча, Касцюшку і Карпінскага. Бо калі б магло дайсці да спецыфічных канфліктаў палякаў з беларусамі ў Беларусі, то хутчэй толькі на гэтым полі. Не ўлічваючы, вядома, драбязы, звязанай з гэтым „паскарэннем бегу спраў”. Так, вось, шчаслівай дарогі і... хуткай візы.

Мацей Халадоўскі

Каля 150 будынкаў часткова (у гэтым ліку 49 жылых дамоў) і 41 гаспадарчы будынак цалкам знішчыла бура ў Елянцы і Кляшчэлях, якая прайшла там 9 ліпеня...

Трагедыя Елянкі і Кляшчэляў

Каля 150 будынкаў часткова (у гэтым ліку 49 жылых дамоў) і 41 гаспадарчы будынак цалкам знішчыла бура ў Елянцы і Кляшчэлях, якая прайшла там 9 ліпеня. Смерч труба знішчыў звыш 10 гектараў лесу і парваў электрычныя правады. Паводле ўступных падлікаў, бура нарабіла шкоду на суму каля 4 мільёнаў злотых.

— Я якраз у хаце была. Спачатку пайшоў дождж і стала вельмі цёмна. Гляджу ў акно і бачу як у суседкі падымае цэлы дах і кідае яго збоку. Чую грукат у сваёй хаце. Стаю і думаю, што ўжо будзе смерць. Калі разваліць хату, то мяне прываліць, — кажа звыш васьмідзесяцігадовая бабуля Вольга Нікіцюк, якая жыве адзінока ў канцы Елянкі. — Кавалкі будынкаў насіла як пер'е. Спалоханая стаяла я ў хаце, а ногі трэсліся ад страху. Калі выйшла ў сені, комін ляжаў на падлозе. На панадворку ўбачыла руіну. Усё было параскіданае, а мой дах за хатай ляжаў. Пражыла я восемдзесят гадоў і такога па-за тэлевізарам яшчэ не бачыла. Старэйшыя людзі таксама не расказвалі, каб такая бура ў нас была. Хіба награшылі мы...

З хаты Вольгі Нікіцюк вецер поўнасцю сарваў дах і знішчыў амаль усе вокны. Бура ўшчэнт разрушыла мураваны хлеў і гумно. Побач хаты сын шкліць вокны. Зяці і ўнукі носяць кавалкі драўніны, жэрдзі і бетонныя кавалкі, што вецер параскідаў на панадворку.

— Дзе ж я пайду са сваёй хаты. Трэба, як найхутчэй зрабіць дах, бо фольга ўжо прабілася і можа працякаць вада. Гаспадарчыя будынкі хіба не будзем ужо адбудоўваць, бо не гаспадарым, — заяўляе Вольга Нікіцюк.

На суседнім панадворку мужчыны парадкуюць тэрыторыю вакол разваленых хлявоў і клуні. З хаты прыкрытай фольгай тырчаць толькі жэрдзі. Каля мураванкі распаложанай з другога боку працуюць электраманцёры. Расцягваюць яны на стаўбы электрычныя правады. Побач раскрытай хаты стаіць сумная жанчына і абапіраецца аб агароджу.

— Калі бура развальвала дом, усярэдзіне былі дачка з зяцем і ўнукамі. Я якраз збірала трускалкі ў сына, а муж паехаў за мной. Не маглі вярнуцца дамоў, бо вывернутыя дрэвы перагарадзілі дарогу. Я лесам прабіралася, каб пабачыць, ці цэлыя сямейнікі, — сказала Ніна Нікіцюк. — На хаце не было даху, а ўсярэдзіне поўна было шкла. Бура знішчыла хлявы, гараж і клуню. Аднак найбольш хаты шкада, бо палопалі таксама сцены. Вецер такі быў, што павыносіў кавалкі даховў далёка за вёску. Трактарныя плугі перакінула з-пад аднаго плота пад другі. Спачатку памагалі парадкаваць войска, паліцыя і пажарнікі. Пасля прыехалі сваякі.

На панадворку спадарства Нікіцюкоў працуе многа мужчын. Парадкуюць яны месца, дзе раней было гумно. Іншых сустракаю каля хлявоў і хаты. Дом прыкрыты фольгай і ідзе падрыхтоўка да выканання даху. З дома выходзіць дзяўчына з рукой у гіпсе.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вецер разрушыў нават мураванкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

З будынкаў у Елянцы пазрывала дахі

— Сарваўся вельмі моцны вецер, які выбіў акенца ў туалеце. У хаце былі са мной дзеці брата і сястры. Калі выбягалі яны з сеняў, шкло з дзвярэй параніла іх у галаву і шыю. Мне, хіба тады, скалечыла руку. Буру, якая працягвалася можа з 5 хвілін, прачакалі мы ў туалеце і спачатку баяліся выходзіць з хаты. Пасля мы выбеглі і ўбачылі, што няма даху і на вуліцы многа людзей. Заўважылі іншыя знішчаныя дамы, хлявы і клуню. Дзеткам лекар забінтаваў раненні ў вёсцы, а мяне брат у гайнаўскую бальніцу вазіў, дзе руку ўзялі ў гіпс, — паясняе Мажэна Рачкевіч.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гаспадарчыя будынкі распаліся ўшчэнт

У чарговым доме вецер крыху менш панішчыў дах, але дашчэнту разрушыў хлявы і гумно. Прапаў гараж, які панесла тарнада. На панадворку Ніны Клімюк працуюць хлопцы з Карыціск. Парадкуюць яны прыгуменне. Каля хаты прыбіраюць сваякі з Махнатага. Хаця бабуля Ніна вельмі змучылася, дапамагае ім.

— Я вельмі грымотаў баюся. Калі пачалася бура, я ўпала на ложак закрыла вушы рукамі і так праляжала да канца грукатання. Калі выйшла на панадворак, вельмі ўстрывожылася з-за раскрытага даху на хаце, цалкам знішчаных хлявоў і клуні. Калі б не дапамога лекара, дрэнна магло б быць са мною. Прыязджалі да нас прадстаўнікі ўлад, але не дапытваліся мы пра дапамогу, бо ў шоку былі. За некалькі хвілін здабытак усяго жыцця прапаў. Клуня, якая збудаваная была на бетонных стаўбах, як аладак ляжыць, — кажа Ніна Клімюк. — За 500 злотых пенсіі не пражывеш і не адрамантуеш будынкаў. З маёй пенсіяй і ў дом для састарэлых не возьмуць. Каб туды патрапіць, трэба, мабыць, пад 1500 злотых пенсіі.

— Бурмістр Кляшчэляў раздаў пацярпелым ад буры па 300 злотых, але за такія грошы мала што купіш, — уключаецца ў размову Вольга Сельвясюк.

— У мяне лес выламатала на 5 гектарах. Нават стогадовыя сосны павыкручвала, — тлумачыць Яўген Нічыпарук. Жыве ён з другога боку дарогі і на яго панадворку знішчэнні невялікія. Тарнада прайшло з аднаго боку вуліцы, дзе разбурыла будынкі. Па другі бок дарогі знішчэнні малыя.

Павятовы цэнтр крызіснага ўпраўлення ў Гайнаўцы з 9 ліпеня арганізаваў дапамогу для пацярпелых у час буры. Жыхарам Елянкі і Кляшчэляў дапамагалі войска, паліцыя, пажарнікі, пагранічная ахова і работнікі накіраваныя Павятовым бюро працы ў Гайнаўцы. Польскі ўрад прыдзяліў 400 тысяч злотых на патрэбы пацярпелых ад буры ў Елянцы і Кляшчэлях. 10 тысяч злотых прызначыла ўправа Гайнаўскага павета і з павятовых сродкаў купілі каля 4 тысячы кв. метраў фольгі, каб часова прыкрыць будынкі. Фінансава ўспамаглі пакрыўджаных гмінныя ўлады Кляшчэляў і Дубіч-Царкоўных. Людзей, якім бура знішчыла дамы і гаспадарчыя будынкі, наведаў міністр унутраных спраў Рышард Каліш. Гаспадары з Елянкі скардзіліся прадстаўніку ўрада, што страхавыя прадпрыемствы ацанілі іхнія страты намнога ніжэй, чым павятовы будаўнічы інспектар Яўген Каліноўскі. На дапамогу жыхарам Елянкі збіралі сродкі ў праваслаўных цэрквах.

Аляксей Мароз

Падляшскі ваявода звяртаецца з заклікам да ўсіх людзей добрай волі, жыхароў Падляшша, прадпрымальнікаў і іх арганізацый аказаць дапамогу пацярпеўшым з найбольш закранутых стыхійным бедствам гмін. Гайнаўскі стараста адкрыў спецыяльны банкаўскі рахунак, на які можна пералічваць грошы для пацярпелага ад урагану насельніцтва:

09 1060 0076 0000 4111 7000 1007

Адкрыты таксама рахункі на ўплаты для жыхароў Кляшчэляў:

20 8071 0006 0018 8519 2000 0070

і для жыхароў Елянкі:

08 8071 0006 0018 8290 2000 0070

Прымаюцца таксама рэчавыя ахвяраванні пацярпеўшым, харчы, будаўнічыя матэрыялы і падобнае. Ахвяраванні можна перадаваць у складавы пункт Павятовага цэнтра дапамогі сям'і ў Гайнаўцы, па вул. Маршала Юзэфа Пілсудскага, 10а, тэл. (0-85) 873 10 15 ад гадз. 8^{00} да 15^{00}.

Музычны конкурс у Нараўцы

У суботу 26 чэрвеня ў Нараўцы адбыўся чарговы міжраённы конкурс „У пошуках фальклору". З музыкай, песнямі і танцамі прыехалі сюды калектывы і салісты з Гайнаўскага і Бельскага паветаў. Ваяводскі дом культуры, як арганізатар гэтага мерапрыемства, ставіць мэту паказаць багацце і прыгажосць старадаўняй абраднасці, музыкі і песні.

Перамаглі ў конкурсе калектывы, якія прывезлі даўнія неапрацаваныя музыкантамі вясковыя песні. Журы не адобрыла прыгожа выкананых і музычна апрацаваных народных песень.

На сцэне ў Нараўцы гасцінна выступіў музычны гурт „Гасцінец" з Гродна. Шмат гледачоў прыходзіць паглядзець выступленні гасцей з Беларусі. Артысты з Беларусі ўмеюць па-мастацку гаварыць, цудоўна спяваць і іграць. Яны патрапяць заваражыць публіку, іх хочацца глядзець і слухаць. Нашым мясцовым аматарам ёсць у каго павучыцца.

Таксама гасцінна выступіў цыганскі калектыў „Кала бала" з паўднёвай Польшчы. Ён прыгожа спяваў песні на незразумелай нараўчанам цыганскай мове.

Музычнае мерапрыемства „У пошуках фальклору" праходзіць у Нараўцы ўжо некалькі гадоў. Заўсёды ў чэрвені над рэчкай Нараўкай лунаюць дапазна песні і музыка.

Мікалай Варанецкі

Добрыя людзі

Жыхар вёскі Бялкі, 47-гадовы непаўнаспраўны Міраслаў Грыгарук, 10 ліпеня раніцай пайшоў у лес па ягады. Хацеў ён такім чынам дапамагчы сваёй маці, але заблудзіў і не вярнуўся дахаты. Шукала яго ўся сям'я, паведамілі паліцыю, але безвынікова. Наступнага дня раніцай зноў пачаліся пошукі. Перад абедам паліцыя паведаміла, што падобны мужчына знаходзіцца ў бельскай бальніцы. Тады сястра з братам хутка паехалі ў шпіталь. Аказалася, што гэта Міраслаў Грыгарук.

У нядзелю вечарам пазваніў мне жыхар вёскі Піліпкі, што ў Бельскай гміне, і стаў распытвацца пра лёс загінуўшага чалавека. Аказалася, што Мірак паявіўся ў вёсцы Піліпкі ў нядзелю з раніцы. Спадарыня Ніна Герасімюк, якая загнаўшы карову на пашу вярталася дамоў, убачыла мокрага змучанага чалавека. Зацікавілася ім. Забрала ў сваю хату, дала паесці і папіць ды папрасіла, каб той адпачыў. Але з Міркам цяжка дагаварыцца, бо ён непісьменны, слаба вымаўляе словы ды мае слабы слых. Муж спадарыні Ніны, Дзмітрый, паведаміў у паліцыю. Прыехалі і забралі чалавека ў бальніцу.

Маці Мірка ад шчырага сэрца дзякуе спадарству Ніне і Дзмітрыю Герасімчукам з Піліпкаў за выратаванне яе непаўнаспраўнага сына, а працаўнікам бельскай бальніцы — за добрую апеку над ім.

Мікалай Лук'янюк

Сёння ў Арлянскай гміне з падаткамі задоўжаны 464 асобы і 21 фірма на агульную суму амаль васьмісот тысяч злотаў. Задоўжанасць 452 фізічных асоб дасягае амаль ста васьмідзесяці пяці з паловай тысяч злотаў...

Арлянскі капіталізм

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Чыгуначная лінія Бельск — Гайнаўка ад дзесяці гадоў зарастае ўсялякім самасеем і... задоўжанасцю Дзяржаўнай чыгункі

Падаткі з'яўляюцца галоўнай крыніцай бюджэтных паступленняў кожнай гміны. Яны вырашаюць пра яе дзейнасць, уплываючы на размах гмінных мерапрыемстваў, а спосаб іх выкарыстання вырашае пра напрамак развіцця. У Арлянскай гміне многія людзі бяднеюць і не маюць з чаго плаціць падаткаў.

Сціплы сёлетні бюджэт Арлянскай гміны (4 817 318 злотаў разам з субвенцыямі і датацыямі ды з планаванай задоўжанасцю вартасцю ў 1 250 тысяч злотаў) складаюць прыходы з падаткаў ад фізічных і юрыдычных асоб ды іншых суб'ектаў на аснове падаткаў зямельнага, ляснога, ад нерухомасцей, транспарту і г.д., якія сёлета маюць унесці 1 500 тысяч злотаў. На аснове падаткавых законаў жыхары гміны павінны плаціць падаткі згодна з вызначанымі Радай гміны стаўкамі. Трэба гэта рабіць нават тады, калі плацельшчык знаходзіцца ў цяжкіх матэрыяльных абставінах, у іншым выпадку за адцяжку налічваюцца адсоткі, а за задоўжанасцю можа з'явіцца секвестратар. Адзінай асобай, уладнай пагасіць падатак ці задоўжанасць, з'яўляецца толькі войт.

Сёння ў Арлянскай гміне з падаткамі задоўжаны 464 асобы і 21 фірма на агульную суму амаль васьмісот тысяч злотаў. Задоўжанасць 452 фізічных асоб дасягае амаль ста васьмідзесяці пяці з паловай тысяч злотаў, з чаго каля васьмідзесяці асоб задоўжаны на больш чым паўтысячы злотаў; ужо за падаткі за першае паўгоддзе г.г. фізічныя асобы задоўжаны на звыш дваццаць тысяч. Юрыдычныя асобы (фірмы) задоўжаны на амаль 535 тысяч злотаў, з чаго за мінулае сёлетняе паўгоддзе на звыш пяцьдзесят шэсць тысяч. Звыш двухсот тысяч вінавата Дзяржаўная чыгунка. Дванаццаць асоб вінаваты гміне амаль шэсцьдзесят тысяч злотаў падатку ад транспартных сродкаў (за першае паўгоддзе г.г. звыш дваццаць адну з паловай тысячу); з гэтага ліку адзін вінаваты звыш трынаццаці тысяч, а некалькі — па сем тысяч.

У Арлянскай гміне пражывае каля 3 700 жыхароў, у тым ліку 3 200 дарослых. Лік жыхароў скарачаецца, але беспрацоўе расце. Людзі ўтрымоўваюцца, галоўным чынам, з працы на сваёй гаспадарцы (каля 800 чалавек), а толькі каля чвэрці тысячы з іншых крыніц. Грамадства гміны бяднее і прыбывае асоб, якія не ў змозе плаціць падаткі. У выключных выпадках войт згаджаецца на льготы некаторым асобам, але іншым задоўжанасць расце, а некаторых сустракае нават найгоршае — прымусовае спагнанне задоўжанасці.

У мінулым годзе войт Міхал Іванчук даў дабро на льготы агульнай вартасцю ў амаль восемдзесят тысяч злотаў, з чаго амаль па палове выпала льготам на куплю зямлі і інвестыцыйным.

— Ці ахвотныя асобы маглі б адпрацоўваць хаця частку сваёй задоўжанасці? — пытаю намесніка арлянскага войта Міхала Гурскага.

— Няма такой формы расплаты за даўгі, хаця ў мінулым такое здаралася: хто з пілой, хто з канём... Аднак прымусовая праца неэфектыўная. Людзі без павагі ставяцца да некаторых спраў і гміна ад гэтага можа пацярпець яшчэ большыя страты. Няхай даўжнік заробіць і заплаціць, бо падаткі — дзесяць ці пяцьдзесят злотаў — не надта высокія. А пакуль не нарміруем нашых эканамічных спраў, не зможам інвеставаць, бо каб атрымаць крэдыт, гміна павінна паказаць высокую падаткавую эфектыўнасць. Кожная задоўжанасць абцяжарваецца карнымі адсоткамі і падаткаплацельшчык сам пападае ў капкан. Некаторыя думалі „а можа неяк там будзе", але, на жаль, сёння такі свет, што даўгі трэба заплаціць. Сёння ў нас капіталізм, — падводзіць выказванне войт.

Міхал Мінцэвіч

Многа шуму, вынік мізэрны

Арганізатарамі фолькавых сустрэч „З вясковага панадворка", цыклічнай імпрэзы, якая праходзіла 25-27 чэрвеня г.г. у Чаромсе былі Таварыства аматараў нацыянальнай культуры, мясцовы ГОК і калектыў „Чарамшына".

— Мэтай мерапрыемства, — сказала дырэктар ГОК Барбара Кузуб-Самасюк, — з'яўляецца падтрымліванне народнай традыцыі ды прапагандаванне талерантнасці да культуры нацыянальных меншасцей і менавіта таму запрашаем гурты з разнародным рэпертуарам — айчынныя і замежныя.

Першага дня канцэрт пачаўся з невялікім спазненнем. Публіку ды гасцей прывітаў войт гміны Міхал Врублеўскі, затым вядучая канцэрт выклікала на сцэну калектыў „Czy to kray". Госці з Мінска запрэзентавалі беларускую музыку ў новай аранжыроўцы. Традыцыйныя песні вясельнага абраду гучалі неяк дзіўна, таму старэйшыя ўспрымалі выступленне памяркоўна. Гурты з Любліна „Etnomalia" і „Jahiar Group" таксама не выклікалі вялікага зацікаўлення публікі.

— Многа шуму, а няма чаго глядзець, — сканстатавалі Аляксандра і Яўген Пагуры.

Амаль двухгадзіннае выступленне гуртоў расчаравала прысутных. Многія пачалі пакідаць гучна-гаманлівае зборышча і адыходзілі дамоў. Я вяртаўся перад дзесятай гадзінай вечара. Не змог я паглядзець калектываў „Tracktor" з Замбковіц-Шлёнскіх і „Kosari" з Роўна (Украіна), бо з-за дажджу іхні канцэрт быў адтэрмінаваны на суботу.

Наступнага дня канцэрт пачаўся з выступлення „Чарамшыны". Затым фальклорныя калектывы з Дабрывады і вёскі Чаромхі запрэзентавалі старадаўнія песні, якія і па сённяшні дзень можна пачуць у час вясельнага абраду.

Калектыў „Laiksne" з Латвіі запрэзентаваў мілагучную народную музыку і ўласныя песні. Гітам суботняй імпрэзы аказалася супольнае выступленне „Чарамшыны" і мінскага калектыву „Тодар". У іхнім выкананні прагучалі папулярныя беларускія песні. Канцэрт працягваўся да позняй ночы. Я пакідаў пляцоўку пасля адзінаццатай вечара, не пабачыўшы „Karpatiyany" з Кіева, тэатра „Makata" і „Orkiestry na Zdrowie" з Варшавы. На суботнім канцэрце прысутнічала больш людзей, чым у пятніцу.

На жаль, меншым зацікаўленнем карысталіся „варштаты" ў фолькавай вёсцы, дзе прэзентаваліся рукадзелле, выстаўка, аўдыёвізуальны спектакль дыяпарамы Гжэгажа Аколава, прысвечаны прыродзе і Белавежскай пушчы. Адно стравы рэгіянальнай кухні манілі аматараў каўбаскі-пальцоўкі, мясных вырабаў, хатняга пірага і хлеба ды малочных прадуктаў.

IX Фолькавыя сустрэчы, на думку маю і большасці старэйшых удзельнікаў, аказаліся няўдалымі. Канцэрты трэба было б арганізаваць у больш адпаведны час, г.зн. не працягваць іх да позняй ночы, пры абмежаванай аўдыторыі. Моладзь можа гуляць да раніцы, але старэйшым належыцца адпачынак.

Уладзімір Сідарук

Міжнацыянальнае жыццё

У пачатку ліпеня Беласток наведала Рабочая Група няўрадавых арганізацый Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прадухіленню і ўрэгуляванню канфліктаў. Група займалася, у першую чаргу, высвятленнем міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, якія склаліся на тэрыторыі Падляшскага ваяводства.

Не сакрэт, што цяперашняя сітуацыя ў вышэйзгаданым аспекце на тэрыторыі былога Савецкага Саюза характарызуецца значнай складанасцю. Часы паказнога інтэрнацыяналізму мінулі, а абуджэнне нацыянальнай годнасці і самасвядомасці, асабліва на пачатку 90-х гадоў, некаторымі „гарачымі галовамі" ўспрымалася як штуршок для распальвання міжнацыянальнай і міжрэлігійнай варожасці. Гэтыя праблемы шмат дзе існуюць і дагэтуль. Праўда, цяпер у многіх месцах яны не стаяць так востра як дзесятак гадоў таму, бо міратворчыя намаганні далі свой плён, але спадзявацца, што канфлікты на міжнацыянальнай глебе не разгарацца зноў было б вельмі наіўна. Менавіта на высвятленне і аналізаванне варункаў жыцця нацыянальных і рэлігійных меншасцей на Падляшшы была накіравана праца Рабочай групы ў складзе дырэктара няўрадавай арганізацыі „Дыялог" з Казахстана Ігара Савіна, аспіранта Белдзяржуніверсітэта, рэдактара часопіса „Палітычная сфера" Андрэя Казакевіча і прадстаўніцы забароненай беларускай праваабарончай арганізацыі „Вясна" Паліны Сцепаненкі.

Госці наведалі рэдакцыю нашага тыднёвіка, дзе мелі змястоўную гутарку з намеснікам галоўнага рэдактара Віталём Лубам. Падчас размовы закраналіся самыя разнастайныя пытанні жыцця беларускай і праваслаўнай меншасці на Падляшшы і ў Польшчы ў цэлым. Як адзначыў В. Луба, вялікі ўплыў на фармаванне і захаванне беларускай самасвядомасці аказвала і аказвае „Ніва", а таксама, зразумела, і іншыя сродкі масавай інфармацыі, дзе можна пачуць ці прачытаць беларускае слова. Гэта значыць, адпаведныя перадачы на радыё і тэлебачанні, штомесячнае выданне „Часопіс". Дыскусія закранула і такія праблемы ў жыцці мясцовага насельніцтва як стасункі паміж людзьмі розных вер і нацыянальнасцей на бытавым узроўні, стаўленне беларускай меншасці да ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз.

Фота УЛАДЗІМІРА ЛАПЦЭВІЧА

Злева: Андрэй Казакевіч, Ігар Савін, Паліна Сцепаненка

Як паведамілі прадстаўнікі місіі, як яны сябе называюць, іх таксама цікавяць адрозненні ў міжнацыянальных і міжканфесійных адносінах паміж Беласточчынай і Гродзеншчынай — двума вельмі падобнымі, на першы погляд, рэгіёнамі. Як адзначыў А. Казакевіч, гэтыя адносіны на Беласточчыне больш напружаныя, чым па той бок мяжы. Тлумачэннем таго ёсць значная розніца ўзроўняў рэлігійнасці насельніцтва Польшчы і Беларусі, а таксама ўсё яшчэ пануючы нацыянальны нігілізм беларускага народа, які перадаецца і на нацыянальныя меншасці. Таму часцяком здараецца так, што выбар паміж абыякавасцю да сваіх каранёў і пачуццём нацыянальнай годнасці ў Беларусі становіцца выбарам паміж прыхільнасцю і апазіцыйнасцю да цяперашняй палітыкі кіраўніцтва беларускай дзяржавы. Прычым гэта раўназначна датычна як нацыянальнай большасці, так і меншасцей.

У той жа час, як заўважыў І. Савін, на Беласточчыне вельмі моцны грамадзянскі элемент у вырашэнні існуючых міжнацыянальных пытанняў. Таму, у пэўным сэнсе, адносіны паміж палякамі і беларусамі, каталікамі і праваслаўнымі ў Польшчы могуць быць узятыя за ўзор у дачыненні да, напрыклад, Цэнтральнай Азіі, дзе яшчэ нядаўна ўспыхвалі ўзброеныя міжнацыянальныя канфлікты.

Акрамя размовы ў „Ніве", госці мелі гутаркі з Яўгенам Вапам як старшынёй Беларускага саюза ў РП і Алегам Латышонкам — старшынёй Беларускага гістарычнага таварыства, супрацоўнікам Кафедры беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку. У Гайнаўцы адбыліся сустрэчы з бурмістрам горада Анатолем Ахрыцюкам і Міхасём Андрасюком — старшынёй Беларускага форуму самакіравання. У Бельску-Падляшскім госці наведалі віцэ-старасту Пятра Божку і старшыню Літаратурнага аб'яднання „Белавежа" праф. Яна Чыквіна. Да канца бягучага года Рабочая група плануе апублікаваць справаздачу аб вывучэнні вышэйазначаных праблем беларускай і польскай меншасных груп, кшталту справаздачы аб аналагічнай місіі ў Букавіне, Прыдняўстроўі, Гагаузіі і Малдове.

Уладзімір Лапцэвіч

Усходнія ініцыятывы

Фонд імя Стэфана Баторыя рэалізуе шматгадовую грантавую праграму, накіраваную няўрадавым арганізацыям у Беларусі і Украіне. Яе галоўная мэта — падтрымка развіцця дэмакратыі і павышэнне ўзроўню ўцягнення грамадзян у жыццё грамадства. Дзеля рэалізацыі праграмы Фонд наладзіў супрацоўніцтва з няўрадавымі арганізацыямі з выбраных абласцей Беларусі і Украіны, якія зацікаўлены ў падтрымцы мясцовых грамадзянскіх ініцыятыў і ў развіцці супрацоўніцтва трэцяга сектара з дзяржаўнай адміністрацыяй, а таксама дзеяннямі ў напрамку змены заканадаўства і адміністрацыйнай практыкі, садзейнічаючых развіццю грамадзянскіх ініцыятыў. Праграма фінансуецца Фондам Форда — 2,5 млн. долараў ЗША — і будзе рэалізавацца ў 2003-2006 гадах.

У мінулым годзе вяліся працы па падборцы рэгіянальных партнёраў, чаму служыў шматэтапны працэс адбору арганізацый-кандыдатаў. Фонд імя Баторыя вырашыў супрацоўнічаць з сямю абласцямі на Украіне і трыма (Брэсцкая, Віцебская і Магілёўская) на Беларусі. У ліпені 2003 г. да няўрадавых арганізацый выбраных абласцей было накіравана запрашэнне да ўдзелу ў конкурсе па адборы партнёраў для рэалізацыі Праграмы грамадзянскіх ініцыятыў. У кастрычніку 2003 г. у выніку конкурсу былі адабраны 10 арганізацый з Беларусі і 19 з Украіны, якія атрымалі права хадайнічаць аб датацыі для рэгіянальных партнёраў Фонду імя Баторыя. Канчатковы адбор партнёраў закончыўся ў чэрвені 2004 года. З Беларусі рэгіянальнымі партнёрамі Фонду сталі пяць арганізацый, а з Украіны — дзесяць. Усходнія партнёры атрымалі паўгадавую датацыю на арганізацыйнае развіццё з магчымасцю атрымаць другую частку гранту на праграмную дзейнасць на наступны год.

Афіцыйнае адкрыццё рэалізацыі праграмы адбылося 2 ліпеня 2004 г. у Варшаве з сустрэчы партнёраў з Беларусі, Украіны і Польшчы, якой спадарожнічала канферэнцыя „Грамадзянскія ініцыятывы ва Усходняй Еўропе". У яе ходзе абмяркоўваліся тры групы праблем: юрыдычнае становішча няўрадавых арганізацый; супрацоўніцтва гэтых арганізацый з самакіраваннем і бізнесам; воблік трэцяга сектара.

У Беларусі юрыдычнае становішча няўрадавых арганізацый найбольш складанае. Можна падзяліць іх на дзве групы: лаяльныя да ўраду (Беларускі патрыятычны саюз моладзі, жаночыя і ветэранскія арганізацыі) і апазіцыйныя (якія не хочуць прымаць удзелу ў палітычнай дзейнасці на баку ўлад). Гэтыя астатнія трактуюцца ўладамі як непазбежнае зло. У 2003 г. ліквідаваных было больш за 5 тысяч арганізацый, не толькі тых неактыўных, але і вядомых сваёй дзейнасцю. Дзейнічае 2 300 арганізацый, з чаго палова ў самім Мінску. Паводле закону, дзейнасць незарэгістраваных арганізацый забараняецца, а пошліна за рэгістрацыю складае 250 долараў, таму каля тысячы грамадзянскіх ініцыятыў існуе незаконна. На 1 600 заявак аб рэгістрацыі задаволеных было толькі 90 прашэнняў. Напрыклад, у рэгістрацыі адной арганізацыі было адмоўлена толькі таму, што яе заснавальнікам аказаўся дзеяч ліквідаванай арганізацыі.

Адным з беларускіх партнёраў Фонду імя С. Баторыя з'яўляецца Віцебскае аддзяленне Грамадскага аб'яднання „Фонд імя Льва Сапегі", якое адкрые пункты юрыдычнай дапамогі грамадзянам з мэтай павышэння грамадзянскай актыўнасці насельніцтва.

Віталь Луба

Клопат пра буслоў

Арнітолагі хвалююцца за спадчынную адсутнасць буслоў у сувязі з вайной у Іраку. Сёлета ў Польшчы праводзіцца падлік маладых буслоў, у якім кожны можа прыняць удзел; апошні такі падлік праводзіўся дзесяць гадоў раней. Расцэньваецца, што ў свеце жыве каля ста шасцідзесяці тысяч буслоў, з таго ліку ў самой Польшчы трыццаць тысяч пар — найбольш на Беласточчыне! У Еўропе гэтых птушак лічаць сімвалам шчасця і... пастаўшчыкамі дзяцей.

Буслы, відаць, любяць нашу краіну з узаемнасцю. На працягу апошніх дваццаці пяці гадоў колькасць бусліных гнёздаў павялічылася ў нас на траціну. Росту колькасці буслянак пасадзейнічалі самыя людзі, якія ідучы за голасам сантыментаў на дахах сваіх будынкаў узводзілі штучныя падставы пад гнёзды — драўляныя краты або колы. Бывае і так, што людзі не хочуць пазбывацца гнязда нават тады, калі трэба разабраць будынак пад ім, напрыклад стадолу, так як у аднаго пенсіянера ў Пашкоўшчыне.

Буслы і самыя бяруцца за справу, часта займаючы бяздзейныя высокія каміны ліквідаваных прадпрыемстваў. Напрыклад, у Орлі пару гадоў таму буслы пасяліліся на коміне былога мясакамбіната, а ў мінулым годзе ў самым цэнтры мястэчка занялі комін старой пякарні.

Міхал Мінцэвіч

Чаму выязджаюць?

Пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз намнога павысіліся цэны харчовых прадуктаў і розных тавараў. Не павысілі толькі пенсій пенсіянерам і зарплат работнікам. Заходнія краіны пачалі шукаць у нашай дзяржаве таннай рабочай сілы. Патрабуюць на працу медсёстраў, лекараў, якія валодаюць нямецкай або англійскай мовамі. Калі, напрыклад, медсястра выедзе на працу за мяжу, там яна часта апякуецца адной старэйшай асобай, мае абяспечаную кватэру і харчаванне ды намнога больш зарабляе, чым у польскай бальніцы. Аднак не кожная медсястра можа сабе на такую паездку дазволіць. Калі яна замужняя і мае малых дзяцей, дык не можа іх пакінуць. Таксама маладыя лекары, на адукацыю якіх дзяржава выдаткавала вялікія грошы, апошнім часам масава з'язджаюць на Захад. Там прапануюць ім намнога карыснейшыя ўмовы працы і зарплаты. Калі здарыцца, што не атрымаюць пасады лекара, часта працуюць у рэстаранах і зарабляюць там намнога лепш, чым у нас лекары. Нашы ўлады аб гэтым не клапоцяцца, яны задаволены, што ў краіне меншае лік беспрацоўных. Калі надалей так будзе, то ў краіне не будзе каму лячыць хворых людзей.

Падумайце аб гэтым шаноўныя ўладары на вярхушцы і прыміце адпаведныя меры, каб палепшыць сітуацыю. Калі павышаеце цэны, павышайце таксама зарплаты і пенсіі, бо людзі ледзь зводзяць канцы з канцамі.

Мікалай Лук'янюк

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гайнаўскія дашкольнікі

Вучацца і гуляюць

Дзеткам Самаўрадавага прадшколля н-р 1 у Гайнаўцы арганізаваны былі сустрэчы з жыхарамі вёсак — дашкольнікі ездзілі на экскурсію ў Кленікі і Скарышэва, дзе пазнаёміліся з колішнім вясковым укладам. Спатканні арганізаваны былі ў рамках праекта „Да тоеснасці. Крок першы — прадшколле", пры фінансавай падтрымцы Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь".

У Кленіках дашкольнікі пабывалі ў рэгіянальным музеі, які працуе ў памяшканнях Падставовай школы. Настаўніца беларускай мовы Вера Флярчук расказала дзеткам, як калісь жылі ў хатах і чым займаліся на панадворках. Паказала яна старыя прылады працы, даўнюю вясковую вопратку, посуд і ручнікі з народнымі арнаментамі. Міхал Фільяновіч са Скарышэва паказаў маладым турыстам старую хату, ткацкія, кавальскія і гаспадарчыя прылады. Дзеткі вельмі зацікавіліся колішнім жыццём на вёсцы. Вярнуўшыся ў прадшколле, спаткаліся яны з музычным калектывам „Дубіны", які пазнаёміў іх з беларускімі песнямі.

Анна Ніканчук з Гарадзіска наведала прадшколле з калаўроткам і расказала, як калісь чысцілі, часалі і пралі воўну. Перад Велікоднымі святамі дашкольнікі аздаблялі вербачкі і фарбавалі яйкі. Іх выхавацелька і каардынатар праекта Міраслава Ніканчук прывозіла выкананыя з цеста „буславыя лапы". Пасля знаёмства з вясковымі абрадамі арганізаванае было застолле.

— Дзеткі раней не спатыкаліся з тым, што ім паказалі ў час нашых заняткаў. Усё, чаго даведаліся, было для іх новым і цікавым, — кажа Міраслава Ніканчук.

Многа дашкольнікаў сабралася ў час спаткання з Адамам Сцепанюком, археолагам музея ў Бельску-Падляшскім, які прыйшоў паказаць як працавалі на нашых землях рамеснікі па вырабе жалезных прадметаў. На сустрэчу прыйшоў ён апрануты ў сярэдневяковую зброю і прынёс прыклады невялікіх жалезных вырабаў. Расказваў, як выконвалася рыцарская зброя, дазволіў дашкольнікам падакранацца да шлема, шчыта і мяча. Пасля аповедаў адбыліся заняткі, у час якіх дашкольнікі спалучалі металічныя элементы ў ланцужкі і бранзалеткі.

— Я сама расказвала дзеткам пра тое, што мне пераказала бабуля. Спявалі мы беларускія песні, дэкламавалі беларускія вершыкі. Хацела я, каб дашкольнікі сустрэліся з вясковай гаворкай і пазнаёміліся са сваімі каранямі. Пазней могуць вучыцца пра абрады іншых краін, — гаворыць Міраслава Ніканчук. — Я заўважыла, што гайнаўскія дзеткі ведаюць паасобныя словы з нашай гаворкі і разумеюць, калі да іх гаворыцца па-свойму. Хочам мы ўвесці ў пастаянную праграму працы прадшколля рэгіянальную адукацыю і тады ўжо ўсе дзеткі будуць знаёміцца з нашымі традыцыямі.

Хаця ўсе сустрэчы арганізаваны былі пасля праграмных заняткаў у прадшколлі, прыходзіла на іх каля 40 дзетак ва ўзросце ад 4 да 6 гадоў. Арганізаваць заняткі Міраславе Ніканчук памагалі Ала Супрун і Люцына Заёнц. Некаторыя дзеткі хочуць паступіць у Падставовую школу н-р 6, дзе вядуцца заняткі па беларускай мове і вясковай традыцыі ды абраднасці. А выпускнікі гэтай школы трапляюць пазней у белліцэй.

Міраслава Ніканчук: Хацела я, каб дашкольнікі сустрэліся з вясковай гаворкай і пазнаёміліся са сваімі каранямі. Пазней могуць вучыцца пра абрады іншых краін...

Аляксей Мароз

Ягорка ды іголка

Ягоркава бабуля Зося носіць акуляры, як ледзь не ўсе нашы бабулі. Бабулям вочы псуюцца і ад узросту. Нямала і плакалі, бо і ад слёз сохнуць вочы, спачатку мокрыя. І ад працы вочы слабнуць, а бабулі шмат напрацаваліся за ўсё сваё доўгае жыццё. З усіх на свеце найдаўжэй жывуць бабулі, і найбольш памятаюць... А на пальцы ў бабы Зосі — наперстак. У Ягоркі акуляры ёсць на носе, хоць яшчэ нестары, ды наперстка — няма. Бабулі наперстак патрэбны, каб іголка ў палец не калола. Бабуля Зося — краўчыха. Праўда, на пенсіі яна ўжо, але шые і шые. Перашывае, цыруе, шые сукенкі, спадніцы, блузкі, штонікі... Прыходзяць суседкі, радня, ды найбольш любіць шыць бабуля Зося свайму ўнучку Ягорку. Найцяжэй з прымеркай. Непаседлівы Ягорка не можа ўтрымацца, калі бабуля накідае на яго пасчаплянае ніткай — пафастрыгаванае адзенне, і сям-там папраўляе, ці добра яно ляжыць, ці не зацесна, ці не засвабодна, ці мо крышку напусціць, а дзе яшчэ адну зашыўку зрабіць, каб пасля, калі падрасце, распусціць?.. Ды нашто шыць навырост! — Ягорка здзярэ новыя нагавічкі раз-два, калі дзе на штосьці не напорацца, праз штосьці пралазячы, то парве невядома дзе. Бо з Ягоркам-непаседам не зраўняецца ніхто, такі ён жвавы, хуткі шалапут, усюды яго поўна. Аж дзіў, што акуляры на Ягоркавым носе трымаюцца, быццам іх там хто прывязаў.

— Дайце мне, бабуля, іголку. І я хачу навучыцца шыць.

— Спачатку скроіць трэба, тое, што сшываць хочаш. Можа, пашый штосьці Аленчынай лялькі? Сукеначку, скажам, ці хвартушок.

— Яшчэ мне лялькамі займацца!

— Можа, будзеш кравец знакаміты, праектант... Чуў, у Італіі, у такой Францыі, найлепшыя краўцы — мужчыны. Гэта ж не лялькамі бавіцца...

— Не марочце, мама, галаву хлапчуку, — азваўся да цешчы Ягоркаў тата, які пасля працы ўзяўся рамантаваць лямпу. — Трэба каб мужчына машынамі займаўся, дамы будаваў, на самалёце лётаў... Я марыў стаць пажарнікам ці паліцыянтам. Цяпер, вось, я — будаўнік...

Ягорка азірнуўся на тату, закруціўся, пасля бачком падаўся ў другі пакой. Бабуля Зося спакойна кончыла перашываць на машыне летнюю сукенку суседцы, якой, патаўсцелай, трэба было ў адзенне ўставіць клінкі. Атрымалася выдатна — і выгадна, і прыгожа.

— Ідзі сюды, бабуля! — клікнуў Ягорка з другога пакоя. — Я табе сукенку скроіў! Ужо сфастрыгаваў, мераць будзем!

І Ягорка накінуў на бабулю доўгую шату з квяцістай заслоны.

— Ой, укалоўся! Без наперстка шыў!

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Хлопцы з Альпена (Палессе)

Час рыцараў

Вандроўкі плямёнаў

У II ст. н.э. Рымская імперыя панавала на прасторы ледзь не ўсёй Еўропы. Яе межы сягалі ад Брытанскіх астравоў па Сахару, ад Іспаніі па Егіпет і Персію. Здавалася, няма такой сілы, якая здолела б яе знішчыць. Аднак у III ст. Рым не здолеў абараніць межаў сваіх адлеглых правінцый. Тады, каб зручней кіраваць, кесар Тадозій падзяліў яе ў 395 годзе на дзве часткі. Яшчэ раней кесар Канстанцін перанёс сталіцу з Рыма ў Візантыю — у Канстанцінопаль.

Гісторыя імперыі ішла непрадбачаным шляхам. Пад канец IV ст. Еўропу сталі наязджаць азіяцкія плямёны гунаў. Гуны сеялі люты перапалох, асабліва на акраінах імперыі. Адтуль уцякалі жыхары ў глыб Еўропы. Такім чынам Рымская імперыя ўсё меншала. На канец германскі вой Одакер, які раней узначальваў рымскія легіёны, скінуў у 476 годзе з прастола малалетняга кесара Рамулюса Аўгустулюса і сам менаваў сябе каралём. Праўда, неўзабаве ён загінуў, аднак і па ім Італіяй стаў упраўляць Тэадорык — князь астраготаў.

Падначаленыя імперыі германскія плямёны пачалі хлынуць у Рым. Франкійцы заваявалі Галію, у Італію прыйшлі астраготцы, а ў Іспанію — візіготцы. На землі Брытаніі наехалі англійцы, саксонцы і ютландцы. На руінах імперыі стварылі ўласныя дзяржавы. Каб зручней кіраваць дзяржавамі, карысталіся рымскімі цывілізацыйнымі вынаходствамі, між іншым, карысталіся рымскім заканадаўствам, якое спалучалі з мясцовымі звычаямі. (Калі ў XVI стагоддзі беларусы стварылі заканадаўства ВКЛ, карысталіся менавіта рымскім узорам).

Першае вялікае каралеўства ў Заходняй Еўропе стварыў вой франкаў Хлодвіг.

(працяг будзе)

Зорка

Лёгкія-лёгкія

(песня „Н.Р.М.")

Здымай сядло,
Гасі святло.
Па плечы снегу намяло.
Ці то ня снег,
Ці проста час
Змяняе свет,
Змяняе нас.

Растуць дамы
Пасля дажджу.
Будуем мы
Сваю мяжу.
Будуем мы
Магутны мур,
Каб там схаваць
Сваю душу.

Прыпеў: Лёгкія-лёгкія
Нашы далёкія.
Цяжкія-цяжкія
Блізкія нашыя.
Светлыя-светлыя
Нашы памерлыя,
Цёмныя-цёмныя
Нашы штодзённыя.

У светлым сне
Ці ў цёмных днях
Сказалі мне,
Што ты — мая.
Ніхто нічый,
Усе — свае.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лявон Вольскі у беластоцкай „чацвёрцы"

І кожны дбае пра сябе.
І кожны сам
Сабе бальзам
На раны лье начной парой.
І мы глядзім
Бязглузды фільм,
Дзе кожны — сам сабе герой.

Прыпеў...

Было і ёсць.
І наша злосць —
Нібыта ў глытках нашых косць.
Над намі страх,
Нібыта сцяг.
І мы жывем, нібы ў гасцях.
Збірай сяброў,
Запальвай газ.
Усё стагоддзе — дэкаданс.
Здымай сядло,
Гасі святло.
Па плечы снегу намяло.

Польска-беларуская крыжаванка № 30

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 26: Груша, круг, крок, прылада, рыса, агмень, салома. Прас, крыга, рыс, школа, арка, граб.

Узнагароды, **кніжку „Казкі дзяцей Беларусі"**, выйгралі: **Наталля Сцепанюк** і **Марта Каліноўская**. Віншуем!

Усё паразбівалі, парвалі нават здымкі. А днём пад'ехала машына, з яе вылез чыноўнік у нагавіцах пад кант, і да старое: Dokąd będziesz tu siedzieć, ty gnojku?!

Яна апошняя пакінула Луку

— Фэсты, фэсты... Нам не да фэстаў. Хай маладыя гуляюць. Мы сваё адгулялі-адпакутавалі.

Над Бандарамі пачынае марасіць дождж, які раптам зменіцца ў залеву. Яшчэ крыху — і над вадасховішчам, дзе якраз паспяхова, пры выдатным ветры, праводзяцца міжнародныя рэгаты, над аціхлым блёкавішчам „аседля Бондары", над адноўленымі па-сучаснаму вёскамі навокал „Семяноўкі" выгляне кволае сонца. У сёлетняе асенняе лета сонца мала. Ловяць яго жыхары бандарскіх блёкаў-пушачак, выходзяць на лаўкі.

— Само рэгаты на Рудні, — кажа Валянціна Камажэўская. — Бавяцца людзі. А нам не да забавы! — падымаецца з лаўкі, дзе сядзела з суседзямі.

— Неўзабаве будзе фэст, — і я хаваюся пад стрэшку ад дажджу.

Нядзеля. Людзі не корпаюцца на сваіх загончыках, якія ўжо і не іхнія. Расце, бо пасадзілі-пасеялі, бо ж зямлі не пакінеш. Чалавек прывык да зямлі. З боку „дзялак" бяжыць хлопец з зяленівам у сетцы — нарваў бабулі да абеду. А ўнук бабы Валянціны — пэўна, пайшоў паглядзець тыя рэгаты; у беспрацоўнага часу шмат. Рабіў быў у цагельні. Звольнілі. Прывёў нядаўна ў бабуліну кватэру яшчэ і нарачоную, і яе трэба накарміць. Бабуля за свае грошы мусіць аплаціць усё — і хату, і „пронд", і есці згатаваць. Заўтра будзе рэнта, а кавалачак хлеба астаўся ды лыжачка маграрыну... На лякарствы грошай ужо няма — пры сваім вострым дыябеце толькі дыету трымае, так сказаць, прымусовую, а лячыцца ўжо не ў змозе. Яшчэ і прыйшлося даплаціць за абаграванне кватэры, паказалі „падзельнікі", што ў завялікім цяпле была. А якое там цяпло! Праз старыя вокны дзьмуў вецер ад возера, мерзла, не магла заснуць без дзвюх пластмасавых бутэлек з гарачай вадой. Не падзыгаеш за 600 злотых, у гэтым і „апякунчае", бо пакантужана...

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— Дзе нам да фэстаў... Валянціна Камажэўская — чацвёртая злева

— Часу ўбывае, смерці прыбывае...

Той час, кажуць старыя, іначай цяпер ім лічыцца. Калі рабілі-гадавалі, не было часу аб часе думаць. Дзевяць гектараў мела Валянціна ў Луцэ. Тры дачкі. Рашылася пайсці замуж, дзесятае дзіця з лучанскае сям'і, тыдзень пасля мамінай смерці. Хто хоча гараваць сіратою! Сваты былі прыехалі ад хлопца з-пад Нарвы. Не ўжыліся. Не хочацца тлумачыць, чаму. Памёр ён ужо, а які быў — яго справа. З гаварні карысці столькі, што з зайца гною... Валянціна забрала сваіх дзяўчатак і вярнулася ў Луку. Паставіла дом, гаспадарчыя будынкі. Гаспадарыла на дзевяці гектарах. Рабіла як конь. А прыйшлі яны, і забралі ўсё тое, чым жылі 142 лучанскія гаспадары. Не хапіла Валі Камажэўскай грошай з тае „кампенсацыі" за пакінутую гаспадарку, каб купіць зямлю. Можа, каб не адна была...

Лучанскія людзі разбегліся па свеце. Хто пайшоў на „лепшае жыццё" ў блёк. На старыя гады каб у цяпле пажыць, рукі склаўшы? Не, не такія гэта людзі, каб ад зямлі адвыкнуць. Тыя з Гайнаўкі ці Беластока, можа, і з нейкай зайздрасцю глядзяць на тых, хто застаўся бліжэй свайго. Хто меў больш кемлівасці ды грошай, паставіў хату ў Новай Луцэ. Ёсць такія, што за пясчаныя лучанскія палоскі дасталі ладны кавалак зямлі на другім баку дарогі, ужо ў Міхалоўскай гміне. А Валянціне Камажэўскай нават і палічыць не змаглі яе зямелькі — ейныя грошы выплацілі ёй і іншай кабеце, з якою не мела нічога супольнага, з другога канца вёскі. Трэ было бязглуздасць чыноўнікаў праставаць варшаўскімі судамі. Пакуль адсудзіліся, дык і грошы вартасць страцілі.

Свой лучанскі дом Валянціна Камажэўская паставіла была на дубовых фундаментах. На сваім, за сваё. Вада падышла пад Луку, ды не ўсю яе заліла. І не пакінула дому Валянціна. Мела кватэру ў блёку, ды начавала не там. Тут была яе сцежка, буялі яе расліны. Пакінутыя дамы належалі цяпер людзям з Беластока, чыноўнікам па справах вады. Яны маглі іх прадаць, маглі іх разабраць ці нават і спаліць. Яўген Смольскі, вось, дзядзькаў старэнькі дом выкупіў, перасыпаў у Новай Луцэ, на ім пабудаваў даміска новае. А хаты Камажэўскай ёй самой прадаць не хацелі. І з дубовымі падвалінамі прадалі. Але пакуль страціла яна дом, прыйшлі ноччу нейкія людзі. Напалохалі, запалохалі. Усё паразбівалі, парвалі нават здымкі. А днём пад'ехала машына, з яе вылез чыноўнік у нагавіцах пад кант, і да старое:

— Dokąd będziesz tu siedzieć, ty gnojku?!

Бабуля якраз падмятала падворак венікам з чартапалоху, дык тым дзеркачом і пагнала чыноўную хамулу. Але пайшла сама ў блёк, — баялася, што і самую ўлялюшчаць.

Цяпер не ходзіць на той бок. Бо і цяжка...

Міра Лукша

Беларусь у Кракаве

Усё часцей беларусазнаўчыя навуковыя сустрэчы арганізуюцца ў Польшчы далёка ад усходняй мяжы. Праўдападобна гэта вынік таго, што беларускай праблемай займаецца штораз больш вучоных у Познані, Торуні, Кракаве, Вроцлаве, Ольштыне, Любліне. У Беластоку, наадварот, з-за крэсавай закамплексаванасці зацікаўленне найбліжэйшым памежжам невялікае.

Трынаццатую канферэнцыю „Дарога да ўзаемнасці" новае кіраўніцтва Польскага таварыства беларусістаў вырашыла арганізаваць у Кракаве. Старшыня ПТБ прафесар Міхал Саевіч і большасць членаў праўлення — супрацоўнікі Універсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне. Раней шматгадовы шэф гэтай арганізацыі, прафесар Аляксандр Баршчэўскі, ладзіў канферэнцыю наперамен — у Гайнаўцы-Белавежы і ў Мінску.

У Кракаве, як аказалася, таксама шмат хто даследуе беларускія гісторыю, культуру, літаратуру ці сучасныя грамадска-палітычныя працэсы. Канферэнцыю арганізавалі ў каталіцкім кляштары уваскрасенцаў, а пра манаскае жыццё ў гэтым месцы напамінала не толькі архітэктура будынка і маўклівыя маладыя манахі, пераапранутыя за афіцыянтаў для абслугоўвання ўдзельнікаў канферэнцыі. Уся сацыяльная інфраструктура, эстэтычныя ўпрыгожанні залаў і калідораў несумненна спрыяюць аблягчэнню кантактаў з Богам. За кляштарнымі мурамі не адчувалася пульсуючага багатага жыцця Кракава.

Як заўсёды вялікую цікавасць удзельнікаў выклікала выступленне Сакрата Яновіча. Гэтым разам вельмі песімістычна накрэсліў ён будучыню беларусаў і Беларусі. Паводле пісьменніка, няма ў найбліжэйшы час у Беларусі перспектываў ні на дэмакратыю, ні на нацыянальнае адраджэнне. Беларусь, за маўклівай згодай Еўропы, пераўтвараецца ў расійскую правінцыю.

Падобна бачыць сітуацыю ў Беларусі старшыня Цэнтра ў падтрымку дэмакратыі Павел Казанэцкі з Варшавы, які гаварыў аб няўрадавых арганізацыях пасля распаду Савецкага Саюза. Сёння, у выніку палітыкі ўлад, пачынаюць яны занікаць як легальныя ўстановы. На іх месцы ўзнікаюць утварэнні накшталт падпольных структур, якія прабуюць выконваць падобную ролю.

Вельмі цікавы даклад пра ролю яўрэйскага насельніцтва ў гарадах Беларусі прадставіў прафесар Станіслаў Аляксандровіч з Торуня. Асабліва адкрыўчым для большасці ўдзельнікаў быў тэзіс дакладчыка пра падобныя метады палітыкі еўрапейскіх манархаў у адносінах да яўрэйскага асяроддзя. Усе пазычалі грошы ад яўрэяў, а калі жыды дамагаліся іх звароту, а найчасцей былі гэта вялікія сумы, кароль ці вялікі князь (у выпадку Літвы) выдаваў закон, які прымушаў старазаконных пакінуць краіну. Большасць пагромаў мела таксама эканамічны кантэкст. З другога боку ў Вялікім княстве Літоўскім жыд, які прымаў хрысціянскае веравызнанне, атрымліваў шляхецтва.

Ірына Лапо з Магілёва прадставіла вобраз паляка ва ўяўленнях студэнтаў беларусістыкі Мінскага і Магілёўскага універсітэтаў. Атрымліваецца, што беларуская моладзь так бачыць палякаў, як палякі ў Польшчы беларусаў. Беларускімі студэнтамі паляк бачыцца чалавекам лянівым, скупым, фальшывым і злосным. У параўнанні са стэрэатыпам расійца вобраз паляка явіцца больш адмоўным.

Як на кожнай канферэнцыі, зачытаных было таксама шмат дакладаў, якіх змест аўтары прадстаўляюць ужо пяты ці дзесяты раз. Выступалі таксама маладыя вучоныя, якія з вялікім энтузіязмам адкрывалі тое, што было адкрытае дзесяткі гадоў таму. Здараецца, аднак, што вучоныя прымяняюць стэрэатыпы ў якасці навукова пацверджанай праўды. Такім чынам можна, напрыклад, пачуць, што беларусы як нацыя на пачатку XX ст. не існавалі, так як і не існуюць на пачатку XXI ст., што дэмакратыя гэта нешта зусім непрымальная беларусам, што „Беларусь — хворы чалавек Еўропы". Калі спрабаваць спрачацца з такімі поглядамі, напрыклад, у Кракаве, часам разгортваецца цікавая дыскусія, пасля якой аўтары раней выказаных тэзісаў пагаджаюцца, што былі яны памылковымі. Інакш у Беластоку, дзе спроба змагання са стэрэатыпамі пра беларусаў можа паставіць апанента ў рады беларускіх нацыяналістаў.

Яўген Міранові́ч

Хто жывы, той умее спяваць

Жывуць Залукі! — тлумачыць нам былая настаўніца гарадоцкай школы Тамара Савіцкая. — Бо за школу трымаюцца з усяе моцы, і дзейнічаюць.

Уся Гарадоцкая гміна сабралася на школьным залучанскім падворку 10 ліпеня на „Купаллі". Арганізавалі забаву тутэйшы калектыў „Каліна" з маладым сваім парасткам „Калінкай", гміна ды Гмінны асяродак культуры, пад прызабытым імем Кастуся Каліноўскага. Напачатку расхвальвалі ў гэту „ноч закаханых" прыгажосць і прыродныя вартасці краявіду на ўскраіне Кнышынскай пушчы. Янка Карповіч склаў сказ і каларытна ды красамоўна расказаў на беларускай мове пра ноч, калі „на Купалы, на Яна толькі раз зацвітае кветка папараці", і пажадаў гасцям знайсці тую кветку да рання. Вечар раней была сустрэча для моладзі і дзяцей, дык, мабыць, і другая папараць-кветка заквітнела ў гэтае спозненае „Купалле". Праводзілася ўсё з вялікім тэмпераментам. Разагрэў публіку, пасля выступлення мілай „Калінкі", арлянскі госць з Пашкоўшчыны, Андрэй Грайко, вядомы народны паэт і „гавэндзёр", сваяк Віктара Шведа.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Русалкі з „Калінкі"

Ягоныя вершыкі аб снапавязалцы, вёсцы Тапчыкалы і жыцці вясковага пенсіянера, хоць даўгаватыя, выклікалі авацыі сярод гледачоў розных пакаленняў. „От, халера, кажуць, штука!.." Калектывы „Арлян", „Асенняга ліста", „Хутара" спявалі доўга ўноч, а калі пайшлі (пасля карагода над Супрасль, дзе дзяўчаты, маладзіцы і бабы пускалі вянкі, якіх лавілі адважныя мужчыны), на пачастунак у абшырную школьную залу, дзе шчодра прымаў іх сам войт Гарадоцкай гміны, гучалі тосты і падзякі, а пад зорным небам шалела моладзь — над вогнішчамі, пад сцэнай, з якой ліліся менш ці больш сучасныя песні. Хто закусваў каўбаску прыпечаную над агнём, хто чым іншым адганяўся ад камарні (зноў ішло на дождж), а пасля госці сталі збірацца ў свае аўтобусы. А там — зноўку песні. „Хто жыве, той умее спяваць!" — тлумачылі „хутаране". У такую ноч кожнае слова важнае. Я папараць-кветкі не мела часу шукаць, ды мяне звочыў старэнькі чытач: „Мірачка, ты пішы болей!". Хто жыве, хай робіць тое, што ўмее. А Залукі — хай жывуць!

(лук)

„Рэклама" гэта не проста „Прыязджайце, будзем добра гуляць, БГКТ запрашае", а прафесійнае гукавое афармленьне і інфармацыя пра гурты, якія маюць выступаць на імпрэзе...

Калі ўкраінцы могуць, дык і мы можам

Што я магла б напісаць у „Ніву" пасля ўкраінскага Купалля ў Дубічах-Царкоўных? Вось гэта, напрыклад: Даволі смешная ідэя, пісаць у „Ніву" аб украінскім народным свяце, але аўтарка наогул бывае смешнай і не пераймаецца гучнымі назовамі. Усе мы на Падляшшы — браты, хаця раз'яднаныя рознымі нацыянальнымі сцягамі. І ўсе нейкім чынам змагаемся за захаванне і развіццё нашай культуры. Пабывала я на мерарыемстве „На Івана, на Купала", якое ладзіў у Дубічах-Царкоўных Саюз украінцаў Падляшша, а два тыдні раней на БГКТоўскім Купаллі ў Белавежы. „Нашае" Купалле рэкламавалі ў беларускіх перадачах па радыё і тэлебачанні, бачыла я таксама традыцыйны (добрае слова, бо такі сам, як у мінулым годзе і, пэўна, у папярэдніх гадах) беленькі плакат на плоце перад Гайнаўскім музеем. „На Івана, на Купала" мела не толькі каляровыя плакаты, якія прыцягвалі ўвагу прахожых у цэнтры майго горада, але таксама выдатную аўдыёрэкламу па Радыё Беласток. „Рэклама" гэта не проста „Прыязджайце, будзем добра гуляць, БГКТ запрашае", а прафесійнае гукавое афармленне і інфармацыя пра гурты, якія маюць выступаць на імпрэзе. Не ведаю, наколькі інфармацыя пра выступаючыя гурты была б патрэбнай для беларускага Купалля, калі там, насамрэч, усе ведаюць, што будзе — фальклор акалічных вёсак і дыска-пола. Магчыма нейкі хор, таксама з фальклорным рэпертуарам. Тым часам у Дубічах было і гэта, вядома, але захавалася патрэбная разнастайнасць — каля першай гадзіны раніцы выступіў рок-гурт „От Вынта". Не ўспамінаючы нават аб моладзі, якая шалела пад сцэнай, большасці публікі гэта падабалася. Нейкі пажылы мужчына, што стаяў збоку, крыкнуў: „Востра граюць, га?". А-га. Востра. І ўсё чуваць. Не здзіўляйцеся, што аб гэтым пішу, бо якасць гуку ў Белавежы традыцыйна змяншаецца ў геаметрычным прагрэсе, калі адыходзіць з-пад сцэны, так што зусім недалёка чуваць толькі ўспамін музыкі. „Вянкі" ў Белавежы гэта мерапрыемства, на якое з'язджаюцца турысты з усёй Польшчы. Гэта мерапрыемства, якое магло б быць візітнай картачкай беларусаў Падляшша. На жаль, яно такой візітнай картачкай ужо ёсць, не ведаю толькі, ці ўсе хочуць, каб панура п'яны натоўп, якому напляваць на спевы жанчын з Курашава, Чыжоў, Арэшкава, і г.д., слабая арганізацыя, і атмасфера не канцэрту, а нейкай вясковай забавы, паказвала людзям з Польшчы, хто мы такія. Ідэя Купалля выдатная, але такое вялікае мерапрыемства не можа мець такой самай арганізацыі як народны фэст у Ліпінах. Няўжо вопытныя дзеячы БГКТ гэтага не ведаюць? Прыемна было пабываць на ўкраінскім Купаллі. Калі яны могуць, дык і мы можам. І наша Купалле можа калісьці перастане быць меккай прыхільнікаў піва, а будзе сапраўдным культурным мерапрыемствам.

Яўдося

Вызваленне Беласточчыны

60 гадоў назад, у ліпені 1944 года прыйшло вызваленне Беласточчыны ад гітлераўскіх акупантаў. Лета 1944 года было вельмі ўдалым для Савецкай Арміі. Савецкія войскі мелі значную перавагу ў ваеннай тэхніцы і вораг быў вымушаны адступаць на ўсіх франтах. Немцы пачыналі разумець, што прайгралі вайну. Савецкія войскі летам 1944 г. вызвалілі Беларусь, Украіну, Прыбалтыку, увайшлі на польскія землі і дайшлі да лініі Віслы. Кожны дзень вайны маскоўскае радыё перадавала ваенныя паведамленні аб сітуацыі на франтах, у якіх гаварылася таксама аб вызваленні гарадоў і вёсак Беласточчыны. Вось некаторыя з іх.

Ваенныя паведамленні

19.07.1944 г.:

„На захад ад Ваўкавыска савецкія войскі фарсіравалі раку Свіслач і занялі шэраг мясцовасцей, між іншым, Крушыняны, Баброўнікі, Зубры, а таксама чыгуначную станцыю Крынкі".

20.07.1944 г.:

„На захад ад Ваўкавыска савецкія войскі вызвалілі шэраг мясцовасцей, м.інш.: Скраблякі, Страшава, Гарадок, Меляшкі і Падазераны".

22.07.1944 г.:

„На поўдзень ад Гродна савецкія войскі працягваючы наступленне вызвалілі мястэчка Крынкі, а таксама звыш 80 іншых мясцовасцей, м.інш.: Кузніцу, Міхалова і Нарву. (...) На брэсцкім напрамку былі вызвалены Сямятычы і звыш 100 іншых мясцовасцей, м.інш.: Боцькі, Журобічы, Волька, Машчона-Каралеўская, Навасады".

23.07.1944 г.:

„На беластоцкім накірунку савецкія войскі ў выніку наступлення вызвалілі звыш 70 мясцовасцей, м.інш.: Баброўнікі, Талькоўшчыну, Залукі, Вялікія-Фальваркі, Трасцянку, Кленікі, а таксама станцыю Жэдню (18 км. на паўднёвы ўсход ад Беластока".

24.07.1944 г.:

„На беластоцкім напрамку савецкія войскі апанавалі раённы горад Саколку і звыш 40 іншых мясцовасцей, м.інш.: Камёнку-Старую, Каралін, Вольку, Студзянкі, Камёнку (10 км. на паўднёвы ўсход ад Беластока".

25.07.1944 г.:

„У напрамку Беластока савецкія войскі занялі звыш 60 мясцовасцей, м.інш.: Заблудаў, Ліпск, Хільмоны, Новы Двор, Супрасль, Каракулі, Саўляны, Пратасы, а таксама чыгуначныя станцыі: Бяляны і Сапацькоўцы".

27.07.1944 г:

„Войскі 2 Беларускага фронту пасля двухдзённых баёў авалодалі 27 ліпеня Беластокам — вялікім прамысловым цэнтрам і важным камунікацыйным вузлом, узмоцненым раёнам нямецкай абароны. Таксама войскі фронту вызвалілі звыш 30 іншых мясцовасцей, м.інш.: Васількаў, Старасельцы, Сольнікі, Жукі".

28.07.1944 г:

„Войскі 1 Беларускага фронту ў выніку акружнога манеўра апанавалі горад і крэпасць Брэст — важны чыгуначны вузел і моцна ўмацаваны раён нямецкай абароны (...). На захад ад Брэста войскі Фронту акружылі нямецкую групоўку ў сіле 3 дывізій".

30.07.1944 г.:

„На поўдзень ад Беластока савецкія войскі апанавалі важны дарожны вузел, горад і станцыю Бельск-Падляшскі, а таксама вызвалілі звыш 60 меншых мясцовасцей, м.інш.: Рыбалы, Аўгустова, Райск, Плютычы і чыгуначную станцыю Страбля (...). Савецкія войскі закончылі ліквідацыю акружанай нямецкай групоўкі на захад ад Брэста (...). Непрыяцель пацярпеў вялікія страты (...). Загінула звыш 15 000 салдатаў і афіцэраў, а звыш 2 000 папалі ў палон. Савецкія войскі ўзялі 32 танкі, 19 браневых гармат, 112 гармат розных калібраў, 133 мінамёты, 306 кулямётаў, 4 000 аўтамашын, 8 000 коней, а таксама шмат іншага абсталявання".

Баі за Беласточчыну цягнуліся да восені 1944 г. Ломжа была вызвалена 13 верасня. На Беластоцкай зямлі загінула многа савецкіх і нямецкіх воінаў.

(Паводле кнігі „Сообщения Советского Информбюро", Москва 1945)

Мікалай Варанецкі

Галоўная старонка ўражвае сваёй яркасцю і, так бы мовіць, фатаграфічнай насычанасцю. Прыемным з'яўляецца і тое, што ўсё напісана там па-беларуску...

dadaslava.at.tut.by

Ужо неяк так сталася, што апошнім часам я часта запрашаю карыстальнікаў Інтэрнэту віртуальна наведаць тыя ці іншыя знакамітыя мясціны Беларусі. Дзякуючы „сусветнаму павуцінню" зрабіць гэта не цяжка і многія краявіды адлюстраваныя на здымках у значнай меры перадаюць асаблівасці таго ці іншага беларускага горада ці мястэчка, старадаўніх замкаў ці проста прыгожага пейзажу. Сёння хачу запрасіць вас наведаць мілы майму сэрцу горад Магілёў, які з даўніх часоў стаіць на высокіх берагах ракі Днепр.

Зрабіць гэтае віртуальнае падарожжа дапаможа цікавы сайт „Фотаздымкі Магілёва", што месціцца пад адрасам http://dadaslava.at.tut.by. Галоўная старонка сайта адразу ўражвае сваёй яркасцю і, так бы мовіць, фатаграфічнай насычанасцю. Прыемным з'яўляецца і тое, што ўсё напісана там па-беларуску і аздоблена нацыянальнай сімволікай — бел-чырвона-белам сцягам і гербам Пагоня. Чырвоныя літары на фоне сфатаграфаванага неба перадаюць галоўны змест сайта і ёсць свайго роду заклікам: „Тут вы маеце магчымасць убачыць беларускі горад Магілёў". Над гэтым сказам, а таксама ўнізе галоўнай старонкі размешчаныя выхады да рубрык сайта. Іх не надта многа, але яны вартыя таго, каб на іх засяродзіць сваю ўвагу.

На старонкі „Здымкі 2001-2002" і „Здымкі 2003-2004" можна выйсці не толькі праз адпаведную рубрыку, але і праз аднайменныя назвы на левым і правым баках галоўнай старонкі, што размешчаныя на фоне выяўлення магілёўскага касцёла св.Станіслава і будынка Дыягнастычнага цэнтра. Там мы можам убачыць выдатныя фотаздымкі цэнтральных вуліц горада на Дняпры, такіх як Першамайская і Ленінская, калісьці насіўшыя назвы Дняпроўскі праспект і Вялікая Садовая. Выяўленні мастоў праз Днепр, самой ракі, начнога горада, зімовых пейзажаў на фоне драматычнага тэатра дакладна перадаюць сапраўдны магілёўскі каларыт. На ўсіх здымках, як на звычайных тэматычных паштоўках, падаецца апісанне таго, што на іх адлюстравана. Памылак няма, але ёсць, на жаль, некаторыя не поўныя адпаведнасці дакладнай назве. Так галоўны магілёўскі праваслаўны храм Свята-Троіцкі кафедральны сабор пазначаны як „Царква", а царква св.св. Барыса і Глеба ў ваколіцах Быхаўскага рынку — як „Царква Б&Г". Здаецца, што чалавеку, які першы раз наведвае Магілёў, тым больш віртуальна, такія „шыфроўкі" цяжка будзе зразумець, тым больш пакінуць у памяці.

Рубрыка „Здымкі 2003-2004", акрамя вышэйапісаных, мае яшчэ некаторыя асаблівасці. Калі казаць аб прыемных уражаннях, то іх пакідаюць фатаграфіі Дняпра і Дубравенкі (другой воднай артэрыі горада), а таксама будынак абласнога выканаўчага камітэта з нацыянальнай сімволікай. Хай апошняе пакуль толькі добрая мара, але распрацоўшчыкі, як, дарэчы, і аўтар артыкула, спадзяюцца, што яна стане рэальнасцю цягам бліжэйшых пяці гадоў, бо год здымка пазначаны як 200?.

Прыкрай нечаканасцю гэтай рубрыкі ёсць тое, што сем яе здымкаў увогуле не адкрываюцца. Штосьці распрацоўшчыкі зрабілі не так і таму некаторыя магілёўскія вуліцы, будынкі і нават сонечны гадзіннік убачыць на гэтым сайце пакуль не ўяўляецца магчымым.

У „Кнізе водгукаў" віртуальны госць Магілёва можа пакінуць свае ўражанні ад візіту, пазнаёміцца з думкамі іншых наведвальнікаў.

Уладзімір Лапцэвіч

Памёр Якаў Шапіра, адзін з сама таленавітых айчынных трэнераў. Самавук паводле адукацыі, выхавальнік-энтузіяст паводле прызвання...

Беларусь, беларусы...

Жыццё кароткае, гульня вечная

Беларускі футбол перацярпеў чалавечую страту. Памёр Якаў Шапіра, адзін з сама таленавітых айчынных трэнераў. Самавук паводле адукацыі, выхавальнік-энтузіяст паводле прызвання, ён стаў паспяховым футбольным трэнерам. На золку суверэнітэту ён з нуля стварыў прыватную дзіцячую каманду „Атаку", вывеўшы яе ў вышэйшую лігу, дзе яна дайшла да чацвёртага месца. Пасля падымаў некалькі клубаў, што былі ў турнірнай нізіне. Апошнім клубам Шапіры стала жодзінскае „Тарпеда", якое сёлета рэальна прэтэндуе (цяпер, можа ўжо, прэтэндавала?) на золата чэмпіянату краіны. А Жодзіна — адзіны цяпер горад у Беларусі, дзе на стадыёне аб'явы гучаць па-беларуску. Якаў Шапіра быў вельмі дасціпным чалавекам, спрабаваў свае сілы ён і ля тэлевізійнага мікрафона. Жыццё абарвалася раптоўна. Пад канец матча з гродзенскім „Нёманам" яго каманда забіла пераможны гол, а трэнера хапіў інфаркт. Шапіру завезлі ў мясцовы шпіталь і яму нібыта стала лепей. Але пад раніцу 42-гадовага футбольнага адмыслоўца не стала...

Падобныя выпадкі здараліся ў футболе і раней. Дастаткова прыгадаць вядомага шатландскага спецыяліста Джока Сціна, які памёр проста на трэнерскай лаўцы. У беларускім футболе таксама былі заўчасныя страты. Рана памёр Уладзімір Грышановіч, які стварыў цікавы клуб „Абутнік" у Лідзе, а пазней настаўнічаў у гродзенскім „Хіміку". Летась маладым адышоў у іншы свет Аляксандр Кісцень, які быў з плеяды мінскіх дынамаўцаў першай паловы васьмідзесятых. Колькі год таму трагічна загінуў Іван Шчокін, які трэніраваў мінскае „Дынама" і салігорскі „Шахцёр". Шчокін быў сама паспяховым беларускім трэнерам на клубным роўні. Смерць напаткала яго недарэчна — Шчокін няўдала скочыў у басейн, фатальна стукнуўшыся галавой.

Футбольнае жыццё тым часам ідзе сваім парадкам. Беларускія клубы стартавалі ў розыгрышы кантынентальных кубкаў. Удалей іншых пакуль выступае лідэр нацыянальнага чэмпіянату — мінскае „Дынама". Яно ў Кубку Інтэртота ў першым раундзе адолела польскую „Одру" з Водзіслава-Шлёнскага, а потым бялградскі „Сарцід". Перамога над сербамі, галоўным тварцом якой стаў гуляючы трэнер мінчукоў Юрый Шуканаў, сталася добрай сатысфакцыяй. Прыгадаем, што менавіта з сербамі засудзілі беларускую моладзевую дружыну на чэмпіянаце Еўропы. Зараз шэраг яе гульцоў, якія выступаюць за „Дынама", дамагліся пэўнага маральнага рэваншу. Наступным супернікам мінскага „Дынама", якое мае даволі добрую рэпутацыю ў Еўропе (беларускі клуб першым у Савецкім Саюзе дасягнуў стадыі 1/4 фіналу ва ўсіх трох тагачасных турнірах — Кубку чэмпіёнаў, Кубку кубкаў і Кубку УЕФА) стане французскі „Ліль". Іншыя беларускія клубы выступілі няўдала. Барысаўскі БАТЭ і „Гомель" свае хатнія сустрэчы прайгралі. Толькі салігорскі „Шахцёр", які ў першым кваліфікацыйным матчы Кубку УЕФА ў гасцях дамогся парытэту з малдаўскім „Ністру" — 1:1, мае рэальныя шанцы на паспяховы зыход барацьбы. Тым больш, што ў нацыянальным першынстве на сваім полі салігорцы не саступаюць ужо некалькі гадоў — унікальная серыя без паразаў дасягнула 55 матчаў.

Уладзімір Хільмановіч

Занатоўкі кантрабандыста

Ашуканцы

— Каб жыць у радасці і шчасці, трэба красці, красці і красці, — рашуча заявіў седзячы ля цёплага лясного вогнішча Мікола. — Большых ашуканцаў чым мы, беларускія кантрабандысты, няма на свеце. Ніхто так не ўмее падмануць і мытніка, і паліцыянта. Таму нас саміх ужо ніхто не ашукае. Мы найвялікшыя на зямлі майстры гэтай справы.

Але гэтая заява выклікала абурэнне ў рэшты п'яной кампаніі, што спынілася пераначаваць у лесе ля Белавежы. Як размова заходзіла пра чэснасць нашай прафесіі, кантрабандысты маглі спрачацца бясконца. Аргументаў было безліч. Хтосьці сцвярджаў, што менавіта кантрабандны рух тавару з'яўляецца рухавіком эканомікі, хтосьці даводзіў, што без нашай працы найбяднейшыя колы грамадства не будуць у змозе знайсці грошы на штодзённую пахмелку. А Васіль нават дадумаўся заявіць, што дзяржаўныя чыноўнікі наўмысна нас правакуюць нелегальна перавозіць праз мяжу спірт і цыгарэты, каб уладкаваць на цёплыя мытныя і памежныя пасады сваякоў. Аргументы на карысць неабходнасці кантрабанднай прафесіі сыпаліся як лісты ўвосень. Жарсці так распаліліся, што ўжо ніхто нікога не слухаў, толькі даводзіў сваё. Хіба спрэчкі зацягнуліся б на тыдзень, каб заўсёды маўклівы, няголены, нямыты і ўвесь час п'яны Юрка, вывярнуўшы свае налітыя спіртам шалёныя вочы, не папрасіў усіх на пару хвілінаў заткнуцца. Прычым зрабіў ён гэта такім гучным голасам, што анямелі не толькі ўсе прысутныя там паплечнікі цёмнай кантрабанднай справы, а нават ранішнія шпакі, што залівалі лясок сваімі птушынымі пералівамі, змоўклі. Нехта потым жартаваў, што гэтыя лясныя спявуны ажно цэлы месяц баяліся раскрыць дзюбы. Толькі адзін сабака з Белавежы адважыўся падаць голас пасля таго як перагрымеў гарматны бас двухметровага пузатага Юркі. І то чамусьці завыў ваўком.

— Не, хлопцы, не мы найвялікшыя ашуканцы на свеце,— рашуча заявіў Юрка. — Найвялікшыя ашуканцы гэта хахлы. Нават мяне аднойчы ашукалі. Да мяне людзі ўвогуле баяцца падыходзіць. Выгляд у мяне нейкі занадта жахлівы. Нават п'яныя пакупнікі абыходзяць. Таму ў мяне заўсёды спірт самы танны. Прываблівае людзей цана. А ўсё адно купляюць толькі тыя, у каго на даражэйшую літроўку ўжо не стае. І то калі моцна нап'юцца, тады толькі страх губляюць.

Неяк гандляваў я на беластоцкім рынку. Іншыя гандляры, як заўсёды, далей ад мяне адсунуліся. І раптам падлятае маладая прыгожая хахлушка і пытае ці можа размясціцца каля мяне. Я вельмі ўзрадаваўся. Нарэшце, думаю, знайшоўся чалавек, які не на знешнасць глядзіць, а на душу. А душа ў мяне добрая вельмі, чулая. Расклала яна нейкія радыёдэталі і адразу пакупнік да яе. Узрадаваўся, што знайшоў гэты тавар, кажа што цэлы месяц шукаў. Толькі вось грошай няма з сабой. Просіць дзяўчыну, каб не прадавала нікому. Злётае, маўляў, за грашыма і ўвесь тавар забярэ. І суму называе такую, што я за год не зарабляю. Толькі ён адышоўся, як прылятае нейкі ўкраінец і кажа, каб дзеўка збіралася, бо аўтобус ад'язджае. А дзяўчо ў плач, просіць каб пачакалі трошкі. А той нават слухаць не хоча. Крычыць, што ён адказны за парадак у групе і ўсе адну чакаць не будуць. Дзяўчына стала збірацца, разраўлася зусім. Слёзы як боб па шчаках коцяцца. Шкода мне яе стала. Я крыкнуў на гэтага кіраўніка групы, аж ён прысеў. Што, кажу, зусім сэрца не маеш. Дай чалавеку зарабіць. А ён мне адказвае, што калі я такі добры, то няхай сам і купляю ў дзеўкі тавар. Дзяўчына адразу за гэтую ідэю ўхапілася. Просіць, каб хоць за палову цаны купіў. Маўляў, хутка прыйдзе той пакупнік, і я зараблю, і ёй назад на Украіну не везці гэтыя рэчы. Заплаціў я ёй і стаў чакаць пакупніка. Гадзіну чакаю, другую, а яго няма і няма. Ужо і людзі разышліся, і рынак зачыняюць, а маім дэфіцытным таварам ніхто і не зацікавіўся.

Не ведаю, колькі я яшчэ стаяў бы, каб не дырэктар рынку. Падышоў ён да мяне, спачувальна пакруціў галавой ды кажа:

— Ва ўкраінкі купіў?

— Ага, — адказваю.

— Ну то выкінь гэтую дрэнь, ды едзь сабе адпачываць. Тая ўкраінка кожны дзень такому дурню як ты нешта падсоўвае. Абрыдла мне ўжо глядзець, як вы кожны дзень да ночы чакаеце нейкага пакупніка. Той пакупнік разам з гэтай дзеўкай і так званым кіраўніком групы зараз недзе твае грошы прапіваюць і з цябе, дурня, смяюцца.

Вось я і кажу, хлопцы, каб не хваліліся вы адзін перад другім, што мы добра ўмеем абдурваць. Далёка нам да сапраўдных ашуканцаў.

Сымон Нальшанскі

ПАЎЛІНА РАІЦЬ

У апошні час многія сочаць за прапановамі працы, аб'явамі ў газетах, дзе прапануецца занятак без выхаду з хаты. Большасці шукаючых працу падабаецца такое вырашэнне хатніх праблем: бо чалавек у хаце сядзіць, і грошы мае, і сам устанаўлівае калі і колькі яму працаваць. Такое вырашэнне падабаецца маладым маці, інвалідам і пенсіянерам, якія ў такі спосаб могуць падзарабіць. Найбольш прапаноў „хатняй працы" знаходзіцца ў Інтэрнэце і ў рэгіянальных газетах, аднак выбіраючы трэба быць асцярожным. Не давяраць тым, якія патрабуюць пераслаць ім грошы на брашуры ці патрэбныя да працы матэрыялы, бо гэта звычайныя ашуканцы.

На самым пачатку трэба праверыць фірму, з якой хочам супрацоўнічаць: даведацца яе эвідэнцыйны нумар гаспадарчай дзейнасці. Калі фірма зарэгістраваная, значыць, яна легальна існуе на рынку. Калі рашымся працаваць у такі спосаб, трэба падпісаць дагавор аб падраднай рабоце. Заключаны ў пісьмовай форме дагавор забавязвае працадаўцу да:

— дакладнага акрэслення абавязкаў і велічыні зарплаты,

— выплаты грошай за беззаганнае выкананне працы (за няякасныя прадукты выпушчаныя з віны падрадчыка атрымае ён ніжэйшую заплату),

— пастаўкі сыравіны і інструментаў патрэбных для выканання працы.

Дагавор аб падраднай рабоце гэта вельмі дарагая для фірмаў форма супрацоўніцтва і таму часта прапануюць яны аўтарскі або падрадны дагавор. Памятайма, што працуючы на аснове аўтарскага дагавору:

— перыяд працы не будзе ўлічаны да працоўнага стажу,

— не атрымаем мацярынскага і адпачынковага водпуску,

— не будзем мець адведзеных пенсіянерскіх і здароваахоўных складчын.

Працуючы на аснове падраднага дагавору:

— атрымаем пенсіянерскае страхаванне,

— будзем мець права на бясплатнае лячэнне (гэта датычыць нават сямейнікаў, якія знаходзяцца на ўтрыманні падрадчыка),

— платнае лекарскае звальненне атрымаем пасля 6 месяцаў працы,

— не маем аднак права на мацярынскі і адпачынкавы водпуск.

Працуючы ў хаце маем свае правы, але толькі тады, калі атрымоўваем за сваю працу прынамсі палову мінімальнай краёвай зарплаты, для „хатнікаў" складае яна цяпер 824 злотых. Калі заробім мінімум 412 злотых, тады маем права на:

— атрыманне водпуску ў памеры 1/12 належнага водпуску за кожны месяц выконванай працы (калі атрымалі мы права на водпуск у памеры, напрыклад, 26 рабочых дзён, то за кожны месяц падраднай працы атрымоўваем 2,2 вольнага дня),

— улічэнне да працоўнага стажу перыяду выконвання падраднай працы, паколькі ад гэтага залежыць вышыня будучай пенсіі,

— атрыманне пасведчання аб выконванні падраднай працы, пасля спынення дагавору,

— атрыманне мацярынскага водпуску,

— захаванне працоўнага статусу ў час хваробы ці водпуску,

— захаванне працоўнага статусу ў час цяжарнасці і мацярынскага водпуску.

Калі працадаўца не заплаціць за выкананую працу, свае правы можна адстойваць у судзе працы (калі падпісаны быў дагавор аб падраднай рабоце), або ў цывільным судзе (калі працавалі мы на аснове падраднага або аўтарскага дагавору). У цывільным судзе мусім аднак уплаціць 8% жаданай намі сумы. Памятайма, што працадаўца не мае права прымушаць падрадчыка да выконвання чарговай працы, калі не заплаціў за папярэднюю работу і не можа прымушаць нас да працы, якая шкодзіць здароўю.

Паўліна ШАФРАН-АСТАШЭВІЧ

З'езд лідчан

Напрыканцы чэрвеня больш за 60 ураджэнцаў Лідчыны, якія пражываюць у Польшчы і Галандыі, сустрэліся ў Лідзе на Міжнародным з'ездзе лідчан, які праводзіцца раз у два гады Таварыствам польскай культуры на Лідчыне.

Сёлетняя сустрэча ладзілася ў Лідзе ўжо ў восьмы раз. Госці наведалі касцёлы раённага цэнтра, педагагічны каледж, выпускнікамі якога з'яўляюцца многія з іх. Пасля сустрэч у сваім родным гададзе, адбылося таксама спатканне з татарскай дыяспарай у Іўі.

Апроч гэтага госці наведалі Навагрудак, возера Свіцязь, Мірскі замак, пабывалі ў Мінску.

Андрэй МЯЛЕШКА

Аб'яднанне Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы смуткуе з прычыны смерці шматгадовага дзеяча і сябра Музея спадара ***ІНАКЕНЦІЯ СІДАРУКА*** *і выказвае спачуванне родным і блізкім.*

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына (35 гадоў), сярэдняя адукацыя, 16 гадоў працаваў сталяром, вадзіцельскія правы кат. В, уласныя машына, майстэрня і матэрыялы, шукае новых кліентаў, зацікаўленых апрацоўкай хат у драўніне, арганізацыяй забудовы панадворкаў, індывідуальны падыход да кожнага кліента, мае вялікі вопыт у царкоўным будаўніцтве, тэл. 730 33 89 (Бельск-Падляшскі).

• Танна прыбяру бюро, кватэру, тэл. 676 17 64.

• Жанчына без дрэнных схільнасцей, сярэдняя эканамічная адукацыя, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 501 948 311.

• Студэнтка заапякуецца дзіцём, вопыт, тэл. 0 601 240 086.

• Мужчына, сярэдняя адукацыя, працавіты, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 503 614 932.

• Шукаю кіраўнічую пасаду, вялікі вопыт у гандлі на пасадзе кіраўніка магазіна, правы кат. В, тэл. 0 603 727 489.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, санітарны мінімум, кніжка здароўя, правы кат.В, добрае веданне нямецкай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 693 332 218.

• Правы кат. В, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, сярэдняя тэхнічная адукацыя, тэл. 0 601 325 011.

• 32-гадовая жанчына шукае працу ў гандлі, вопыт, правы кат. В, тэл. 0 505 617 399.

• Маладая жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, вопыт у працы ў бюро, шукае працу ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 503 713 915.

• Механік з вопытам шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0 604 960 657.

• Абітурыентка маркетынгу і англістыкі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 608 885 261.

• Жанчына, 42 гады, шукае працу ў ваколіцы Старасельцаў, танна прыбярэ, зварыць, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 710 90 03.

• Мужчына, 37 гадоў, механік з вопытам шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0 604 960 657.

• Кніжка здароўя, санітарны мінімум, правы кат. В — студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, тэл. 745 35 62.

• Жанчына, 47 гадоў, шукае часовую працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 730 63 16.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат вольнага часу (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 606 431 022.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

• Студэнтка ахвотна заапякуецца малым дзіцём у ранніх гадзінах, Беласток, 718 84 13.

• Маладая жанчына, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, дзейсная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704.

• Бухгалтар шукае працу ў Гайнаўцы, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, веданне фіскальнай касы, тэл. 0 694 127 686.

• Бухгалтар з вопытам, уласнай машынай, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 609 766 577.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Сям'я з трыма дзяцьмі будзе ўдзячная за любую помач.

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка і яды.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Старэйшае сужонства, якое выхоўвае ўнукаў, патрабуе мэблі, пасцелі і ботаў для 5- і 10-гадовых хлопцаў і 7- і 11-гадовых дзяўчат.

• Удавец патрабуе адзення для сыноў ва ўзросце 12 і 15 гадоў і старой мэблі.

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка, пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае шасцёра дзяцей, патрабуе пасцелі, старой мэблі, адзення.

Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна ШАФРАН-АСТАШЭВІЧ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

У нядзелю бабулька збіралася ў царкву. Пазваніў тэлефон, у якім дачка спытала яе, ці згадзілася б на прыезд траіх унукаў, бо яна з мужам збіраюцца выехаць у водпуск. Бабулька была так задаволена, што з радасці кінула на тацу ў царкве дваццаць злотаў. У чарговую нядзелю, пасля ад'езду ўнукаў дадому, бабулька ахвяравала на тацу пяцьдзесят злотаў...

* * *

Перад Калядамі ксёндз сустракае двух панкаў на вуліцы:

— Заглянулі б, хлопцы, хаця разок у касцёл: паглядзелі б батлейку, паспявалі б калядкі...

У адказ панкі рассмяяліся.

— Неахайнікі! — абурыўся ксёндз і адыходзячы дадаў: — Хаця б ванную калі прынялі...

Па хвіліне адзін панк пытае:

— Што такое ванна?

— Не ведаю: я ніколі не быў у касцёле.

* * *

Гутараць два суседы:

— Чуў я, што ты змяніў работу...

— Гэта праўда: з-за здароўя...

— Што табе дакучае?

— Мне нічога, але мой дырэктар, калі толькі мяне ўбачыў, заўсёды гаварыў, што яму робіцца дрэнна і цягне на ваніты.

* * *

— Ці вы забабонны? — пытае дырэктар новага працаўніка.

— Не надта.

— Гэта вельмі добра, бо хачу вас папярэдзіць, што не плацім трынаццатай зарплаты.

* * *

— Калі канчаецца мядовы месяц?

— Тады, калі муж перастае дапамагаць жонцы мыць пасуду і робіць гэта сам.

Музычныя навіны

„Беларуская музычная альтэрнатыва" абвясціла пра пачатак працы над новымі складанкамі. Плануецца выдаць чатыры новыя рэлізы. Два з іх — гэта працяг большменш паспяховых „Hard Life — Heavy Music" і „Hardcoreманія: чаду!", якія былі выдадзеныя БМА некалькі раней. Астатнія два — эксклюзіўныя праекты.

Упершыню будуць сабраны беларускамоўныя панк-гурты. Працоўная назва — „Чыста Punk". Ужо вядома, што ўдзел у праекце возьмуць гурты „Nothing To Lose" з Жодзіна, „Тлуста Луста" з Гродна, „Кнот" і „Тарпач" з Мінска, разглядаецца „Ѣygimont Vaza", „Голая манашка", „Neuro Dubel", „Deviation", „Кальян".

Пра эксклюзіўнасць чацвёртага праекта казаць цяжка... „Піўны альбом", у праграму якога плануецца ўключыць рознастылёвыя гімны бурштынаваму напою ад Лявона Вольскага, Зміцера Вайцюшкевіча, гуртоў „Крама", „Neuro Dubel", „Камэлот", „P.L.A.N.", „Стары Ольса" і іншых.

Узяць удзел у гэтых чатырох праектах можа любы гурт. Для гэтага неабходна даслаць фанаграмы сваіх песень на наступны адрас: 220085, Мінск-85, а/с 5, Віталю Супрановічу. Асноўныя крытэрыі, па якіх будуць адбірацца песні наступныя: добрая якасць запісу, прытрымка адпаведнаму стылю і, канешне, беларускамоўнасць дасланага матэрыялу.

„Крамбамбуля" (фота) завяршае запіс свайго міні-альбома. Тым часам на суд слухачоў вынесена новая песня „Турысты", запісаная з Сяргеем Міхалком. „Турысты" — гэта, у пэўным сэнсе, працяг песні „Госці". Толькі калі ў апошнім выпадку гаворка ішла пра прыезд замежных гасцей „да нас", дык зараз „нашыя" апынуліся ў ролі гасцей у замежжы.

З дасланых на сёлетняе „Басовішча" 32 заявак журы ў саставе: Ілона Карпюк (старшыня БАСу, галоўны арганізатар), Вячаслаў Корань (старшыня журы, гурт „Уліс") і Аляксандр Памідораў (каардынатар на Беларусь, гурт „Pomidor/off") **адабрала 10 гуртоў** для ўдзелу ў конкурснай частцы фестывалю. Гэта: „Аніма" (Мінск), „5set5" (Гарадок), „Cor-Set" (Мінск), „ГМП" (Варшава), „Пульс Вакол" (Мінск), „Тарпач" (Мінск), „Taxi" (Мінск), „Тэзаўрус" (Мінск), „Тлуста Луста" (Гродна) і „Змяя" (Мінск).

Татка Стэп

25.07 – 31.07



Баран (21.03. — 19.04.) Секстыль Марса з Венерай (26.07. — 28.07.) паможа перахапіць табе ініцыятыву ў любоўных справах. Узрост энергіі і сілы волі. Калі маеш ахвоту пазмагацца, будзеш мець падтрымку зорак.

Бык (20.04. — 20.05.) 24.07. — 26.07. пазбягай новых знаёмстваў і новых абяцанняў. Кантралюй свае выдаткі. Адчуеш сябе прыгожым і знакамітым, ды без, так сказаць, „перасады"!

Блізняты (21.05. — 21.06.) 25.07. слухай сам сябе, а не чужых парад; усё ж, пэўна, паслухаеш чыіхсьці падшэптаў... Не шукай дзіркі ў цэлым, бо там яе няма. Папрасі прабачэння ў блізкіх. Можаш атрымаць грошы — ад страхоўкі, кампенсацыі, ці з суда...

Рак (22.06. — 22.07.) Шмат энергіі, а нават адчайнасці. Рэдкі ў цябе энтузіязм. Не падвядуць цябе сябры. Пастарайся не падыходзіць да ўсяго з такімі эмоцыямі.

Леў (23.07. — 22.08.) Маеш час урэшце прачытаць тыя кнігі, да якіх збіраешся ўжо даўно. Зробіш усё, каб здабыць адну асобу, але не пераборшчвай з гэтым адчаем. Можаш шмат зрабіць у прафесійных справах, знакаміта дагаворышся з супрацоўнікамі і шэфам. Мінімалізуй кошты.

Дзева (23.08. — 22.09.) Дагаворышся нават з тымі, з кім дагэтуль не ўдавалася (не толькі табе!). Не рабі націскаў на партнёра. Засумуеш за роднымі. Абавязкова схадзі да лекара.

Шалі (23.09. — 23.10.) Большае заангажаванне ў кантакты з роднымі. Твае сябры знойдуць выхад нават з тупіка. Час на дысцыпліну, творчую канцэнтрацыю і высілак, нават калі ты ўжо ходзіш у лаўрах.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Зласлівасць і востры язык могуць павялічыць колькасць тваіх ворагаў. У час поўні Месяца (31.07.) можаш выйсці з сябе і зрэагаваць залішне нервова. Добрыя перспектывы ў сяброўстве. Дзякуючы Стральцу ды Льву адчуеш большую ўпэўненасць.

Стралец (22.11. — 21.12.) Не будзеш наракаць на здароўе. Сярэдне з эмоцыямі і грашыма. Твае новыя ідэі, але і выпадак, узмоцняць тваю прафесійную пазіцыю.

Казярог (22.12. — 20.01.) Можаш урэшце падумаць аб адпачынку. Добры час пабольшыць маёмасць, падняць свой прэстыж. Больш пі і дбай аб ныркі.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Няма для цябе спраў, з якімі можаш не пазмагацца (поспех!). Можаш 31.07. найвастрэй убачыць слабыя бакі свае сувязі з партнёрам. Поўня шчасця свежазакаханага Вадалея.

Рыбы 20.02. — 20.03.) Шмат працы і творчых ідэй. Добры час выявіць свае пачуцці. Найбольш трапныя развязкі — самыя простыя. Рыба, якая стала сумнявацца ў сваім таленце — падтрымаюць цябе зоркі! Гавары ўласным, поўным голасам аб тым, што ляжыць на душы і сэрцы. Абавязкова знайдзі час на адпачынак!

Агата Арлянская

Адгаданка

Шыфраграма. Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне.

1. конскі ласунак; калі пасееш яго ў гразь, будзеш князь = 20 _ 54 _ 72 _ 71 _;
2. тата = 38 _ 37 _ 76 _ 8 _ 48 _ 39 _;
3. орган слыху = 12 _ 13 _ 63 _ 11 _;
4. умацаваны абаронны агнявы пункт = 65 _ 66 _ 64 _ 14 _;
5. без агню яго не бывае = 56 _ 59 _ 58 _;
6. галоўны мусульманскі храм у Мекцы з Чорным Каменем = 1 _ 2 _ 45 _ 3 _ 42 _;
7. хросны бацька ў адносінах да бацькоў хрэсніка і да хроснай маці = 36 _ 51 _ 21 _;
8. доля, ход жыццёвых падзей = 10 _ 77 _ 9 _;
9. вельмі кароткі прамежак часу або абрэвіятура савецкага знішчальніка канструкцыі Мікаяна і Гурэвіча = 29 _ 28 _ 30 _;
10. споравая расліна без каранёў і кветак, якая расце ў вільготных мясцінах, на дрэвах, каранях = 16 _ 23 _ 22 _;
11. трываласць, сіла, магутнасць = 50 _ 49 _ 43 _;



12. партнёр жонкі = 60 _ 70 _ 73 _;
13. нітка = 33 _ 25 _ 26 _ 27 _;
14. памяшканне паміж жылой часткай дома і ганкам у вясковых хатах = 40 _ 35 _ 34 _ 67 _;
15. мадэль, узор, форма, катэгорыя, індывідуум = 41 _ 62 _ 24 _;
16. месца заслоненае ад сонца або месяца = 68 _ 32 _ 31 _ 69 _;
17. вязкая маса з мукі замешанай на вадзе або малацэ = 7 _ 53 _ 4 _ 5 _ 6 _;
18. вялікая венгерская рака, левы прыток Дуная = 44 _ 47 _ 19 _ 18 _;
19. сіняватая афарбоўка скуры пры некаторых захворваннях звязаных з расстройствам кровазвароту, сінюшнасць, сінюха = 75 _ 15 _ 55 _ 52 _ 57 _ 61 _;
20. службовы разрад служачых, пасада = 17 _ 74 _ 46 _;

(ш)

Падказка: цыяноз — выследак расстройства кровазвароту.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 24 нумара

Боб, віна, Іерусалім, лепра, маўр, меню, Мінін, печ, сасна, сук, уюн, чарка.

Рашэнне: **Любоў маскіруе прамінанне часу, час маскіруе прамінанне любві.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

ISSN 0546-1960